№ 21 (331) 6 чэрвеня 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

П Е Р Ш А Я   Б Е Л А Р У С К А Я   Г А З Э Т А

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

**«Свабодная Беларусь»**

Новы палітычны блёк на чале з Саньнікавым, Красоўскай, Шчукіным.

старонка 3

**Сорак тысяч — у балота**

Званец. Дарагічынскі раён. Берасьцейская вобласьць

старонка 6

**Архівы беларускіх прэзыдэнтаў**

Расьследаваньне Сяргея Ярша.

старонка 14

**Ліцэй пасьля Курапатаў**

Карпаратыўны наступ бюракратыі.

старонкі 4–5

# Руслан Салей: як стаць героем




AP

**Пакуль зборная прыходзіла ў прытомнасьць пасьля Фінляндыі, а фэдэрацыя пакутліва вызначалася з Захаравым, Беларусь захоплена сачыла за нараджэньнем новага героя хакею.**

Фінал Кубку Стэнлі — тое месца, дзе куюць мэтал найвышэйшае пробы. Час, які бавіць Руслан Салей на пляцоўцы ў гульнях (ад 20 да 26 хвілінаў за гульню), лепей чым што пацьвярджае яго надзейнасьць і давер да яго з боку трэнэраў «Анагайму». З добрага сілавога абаронцы Руслан ператварыўся ў сапраўднага тэрмінатара, разбуральніка нападніцкага патэнцыялу суперніка.

Гол, які ён закінуў у овэртайме трэцяга матчу ў браму «Нью-Джэрзі», тэхнічна бездакорны, ададзіў надзею «Анагайму» на станоўчы вынік усяе сэрыі. Беларускі хакей набыў майстра, якога дагэтуль ня меў.

НХЛ гартуе перадусім характар. Тыя, хто мае недастатковую матывацыю, у Лізе не забаўляцца. У турнірах Нямеччыны альбо Расеі планка напругі значна ніжэйшая. Мо якраз адсутнасьць у Фінляндыі Салея, ды яшчэ харызматычнага капітана Аляксандра Андрыеўскага, прывяла да таго, што Беларусь вылецела з элітнай абоймы. Камандзе не хапіла характару, які быў козырам зборнай раней. Характару, які ўвасаблялі гэтыя людзі.

Руслан Салей — як Шварцэнэгер у кінэматографе — чалавек, які зрабіў сябе сам.

Цяпер цяжка сказаць, калі мы здолеем убачыць Руслана ў форме нацыянальнай каманды: група «В» не ягоны ўзровень. Дый мэнтальна пасьля НХЛ ня ўпісваецца ён у беларускія хакейныя рэаліі, з усімі нашымі «Залатымі шайбамі», прэзыдэнцкімі камандамі і боўтаньнем між небам і зямлёй. НХЛ — іншая цывілізацыя, дзе камандуюць прафэсіяналы, а не міліцыянты.

Хакеіст Руслан Салей на сваім асабовым чалавечым узроўні зрабіў тое, што мусіць зрабіць кожны з нас і краіна ў цэлым. Рэалізаваць свой патэнцыял. Стаць героем.

**Алег Дашкевіч**

«ХАВАНШЧЫНА»/«КАРАЛЕВА ЧАРДАШУ»



ГЕНАДЗЬ ЖЫНКОЎ

**У «Каралеве чардашу» Натальля Гайда пераўзышла саму сябе. Але супадзеньне прэм’ераў «Хаваншчыны» і «Каралевы» ў адзін дзень нарабіла бяды. Працяг тэмы на старонках 12—13.**

# Эстафэта салідарнасьці з «БДГ»


САЛІДАРНАСЦЬ
С БЕЛОРУССКОЙ ДЕЛОВОЙ ГАЗЕТОЙ
3 июня 2003 года
ЭХО
ЕЖЕНЕДЕЛЬНИК
№1
4 июня 2003 года
www.bdg.by
БЕЛОРУССКОЙ ДЕЛОВОЙ ГАЗЕТЫ

У аўторак у Менску зьявіўся новы нумар тыднёвіка «Салідарнасьць» з дзьвюхмоўнай шапкай: «Салідарнасць с Белорусской деловой газетой». У сераду выйшаў нумар «БДГ» пад шапкай новага тыднёвіка «Эхо». Чытачы знаходзілі выданьне, выхад якога быў прыпынены на тры месяцы Міністэрствам інфармацыі, у прыватных распаўсюднікаў. У чацьвер меўся выйсьці такі ж праект з «Предпринимательской газетой», а ў пятніцу — зь «Belarus Today». Аднак у сераду стала вядома пра звальненьне дырэктара друкарні «Чырвоная зорка», дзе публікаваліся газэты, якія былі далі часовую «шапку» «Белорусской Деловой». Таксама «Предпринимательской» паведамілі, што «ў сувязі зь нездавальняльным станам друкарскай машыны» нумар надрукаваны ня будзе, а дамовы з «Предпринимательской газетой» і «Эхом» разрываюцца.

У якія дні газэце ўдасца выходзіць надалей, покі няясна. Выдавец «БДГ» разглядае магчымасьць друку за мяжой, дакуль ня вырашыцца канфлікт з урадам. Вышэйшы гаспадарчы суд будзе разглядаць справу папярэджаньняў «БДГ» 10 і 16 чэрвеня.

Пытайцеся «БДГ» у прыватных распаўсюднікаў.

**Ніўскі**

**P.S.** Прыпынены на тры месяцы і выхад газэты «Навінкі».

# Легенда друку

**У выдавецтве «Тэхналёгія» выйшаў чацьверты выпуск факсымільнага выданьня «Нашай Нівы» складзены з нумароў газэты за 1911 г.**

Тэхнічная праца над гэтым выпускам (падрыхтоўка і друк) доўжылася амаль два гады. Крыніцамі для ўзнаўленьня гадавіка сталі кнігазборы Міхася Казлоўскага, Янкі Саламевіча, Арсеня Ліса й Беларускага дзяржаўнага архіву-музею літаратуры й мастацтва. Наклад выпуску — 1000 асобнікаў.

Працяг на старонцы 2.




12 чэрвеня а 16-й у Нацыянальнай бібліятэцы адбудзецца прэзэнтацыя факсымільнага выданьня, у якой возьмуць удзел Віталь Скалабан, Валянціна Лемцюгова, Анатоль Сідарэвіч, Андрэй Дынько.

# Легенда друку

Працяг са старонкі 1.

«Складанасьці ствараў чыста тэхнічны бок падрыхтоўкі, — кажа галоўны рэдактар «Тэхналёгіі» Зьміцер Санько. — Выдавалася газэта на кепскай паперы, старонкі нярэдка прабітыя фарбай, пашкоджаныя часам і карыстальнікамі. Але ўдалося аднавіць усе да адной старонкі. Факсымільны варыянт друкуецца на якаснай афсэтнай паперы, і жыць ён будзе куды даўжэй, чым арыгінал». Кніга зьявіцца ў продажы ў сярэдзіне месяца.

«Нашаніўскі праект» не абмяжуецца толькі факсымільным выданьнем гадавікоў газэты. Рыхтуецца таксама «Слоўнік мовы «Нашай Нівы», створаны калектывам моваזнаўцаў пад кіраўніцтвам Валянціны Лемцюговай (ён плянуецца ў 5 тамах, першы зь якіх пабачыць сьвет ужо сёлета). Мае быць падрыхтаваны і даведкавы том з індэксамі імёнаў, псэўданімаў, твораў і геаграфічным паказальнікам. Ён пабачыць сьвет, як мяркуецца, да 100-годзьдзя нашай газэты.

**АВ**

# Арыштоўваюць выбраных

**У Беларусі працягваюцца арышты чыноўнікаў ды кіраўнікоў прадпрыемстваў. За краты патрапіў і дырэктар Гомельскага суднабудаўніча-суднарамонтнага заводу Корзун. Яго вінавацяць у лабіяваньні інтарэсаў расейскага бізнэсу.**

У траўні 2002 г. пачалася працэдура банкрутства прадпрыемства, і лёс ягоны вырашаў суд. Завод запазычыўся 19 крэдыторам (адзін зь іх — дзяржбюджэт — не атрымаў 139 млн рублёў). Выйсьце бачылася толькі ў продажы маёмасьці. Але ўвосень крэдыторы далі гомельцам апошні шанец — прадугледжаныя законам 18 месяцаў на «фінансавае аздараўленьне».

Дырэктара арыштавалі супрацоўнікі Камітэту па барацьбе з арганізаванай злачыннасьцю. Як сьцьвярджаецца — у момант атрыманьня ад расейцаў 5 тыс. даляраў хабару. Корзун нібыта дапамагаў расейскай фірме набыць па заніжаных коштах цэх свайго заводу. Супраць ужо былога дырэктара ўзбуджаная крымінальная справа, Корзуну пагражае ад 5 да 10 гадоў турмы. «Аздараўленьнем» прадпрыемства будуць цяпер займацца іншыя людзі.

На думку кіраўніка гомельскіх «Грамадзянскіх ініцыятываў» Віктара Карніенкі, такімі арыштамі рэжым хоча адцягнуць увагу людзей ад сур'ёзных эканамічных праблемаў альбо перакласьці адказнасьць за іх на т.зв. «стрэлачнікаў». «Лёгіка ўлады заключаецца ў тым, каб прыцягнуць да адказнасьці ня ўсіх, хто парушаў закон, а толькі выбраных», — кажа В.Карніенка.

**Алег Тачоны**

# Імёны тыдня



**Ігнат Дамейка** цяпер яшчэ і дыназаўр. Чылійскія навукоўцы назвалі ў яго гонар новаадкрытую рэліктавую пачваруну зь сямейства тыраназаўраў. Дамейказаўр чылійскі жыў пры канцы крэйдавага пэрыяду, меў восем мэтраў у даўжыню і два ў вышыню ды харчаваўся лісьцем араўкарыі.

**Зьміцер Піменаў** і **Вадзім Кабанчук** узначалілі стварэнае ў Бэльгіі Беларуска-эўрапейскае задзіночаньне. Таксама 50 сем'яў новаэміграантаў у Антвэрпэне стварылі новую грэка-каталіцкую парафію.

**Барысаўскія зуброўцы** пакляліся паставіць новы крыж на месцы расстрэлу ўдзельнікаў антысавецкіх выступленьняў 1920—30-х. Стары, перавязаны бел-чырвона-белым сьцягам, у ноч з 29 на 30 траўня хтосьці скраў.

**Леанід Мальцаў** загадаў дзеля эканоміі ліквідаваць Барысаўскі вайсковы шпіталь і стварыць на яго базе вайсковую паліклініку. З 152 дактароў і сёстраў туды возьмуць толькі 52. Ліквідаваныя таксама шпіталі ў Лідзе, Берасьці, Слуцку, Полацку, застанецца толькі супэрсучасны ў Менску.



IREX-PROMEDIA

**Аляксандар Шаранкоў**, дэпутат Гарадоцкага райсавету, склікаў у Езярышчы талаку, каб адрэстаўраваць плаціну на Обалі.

Рака паглыбела, гэта дазволіць людзям плаваць.

**Антон Ляшчэвіч і Юры Кашыра**, ксяндзы-пакутнікі зь вёскі Росіца (Верхнядзьвінскі раён), сталі героямі фільму «Да хвалы Алтара». Стужку зьнялі Ірына Жарнасек і Андрэй Сухаржэўскі.

**Біл Клінтан** выказаўся за адмену 22-й папраўкі да Канстытуцыі ЗША, якая не дазваляе прэзыдэнту знаходзіцца ля ўлады больш за два тэрміны. А пасьля падсумаваў: «Да мяне гэта, відаць, ня будзе мець дачыненьня».



**Абдурахман Мустафа**, курд-юрыст, абраны бурмістрам Кіркуку, што на поўначы Іраку. Пры Хусэйну адсюль былі выгнаныя каля 200 тыс. курдаў, а на іх месцы паселеныя арабы з поўдня краіны.

**Уладзімер Пронін**, шэф маскоўскае міліцыі, выступіў за дэпартацыю з гораду ўсіх прастытутак. Іх у расейскай сталіцы сто тысячаў, таму без павелічэньня штату міліцыі яму не абысьціся.

**Хідэка Арыма** зь Японіі адсьвяткавала 101-годзьдзе на працоўным месцы — за стойкай свайго бару. Яна адзіны чалавек у сьвеце, які ў такім веку ўсё яшчэ ходзіць на працу.

**Аляксандар Мазанаў**, менскі дызайнэр, перамог на конкурсе Міністэрства прыродных рэсурсаў і Прадстаўніцтва ААН на найлепшы знак для маркіроўкі экалягічна чыстай прадукцыі. Ягоны варыянт — сылюэт лістка на фоне блакітна-зялёнага шару.



ЗАМЕЖНАЯ ПАЛІТЫКА

# У Эўразьвяз увойдзем па-грэцку

Пры канцы траўня Менск наведала дэлегацыя італьянскіх палітыкаў і навукоўцаў. Фармальнай мэтай візыту быў удзел у сэмінары «Вучыцца ў Эўразьвяза: падтрымка дэмакратычных рэформаў», нефармальнай — сустрэча з беларускімі ўрадоўцамі.

26—28 траўня ў Белдзяржунівэрсытэце чакалі міністра Мартынава і загадкавага «сыньёра Панькова» з Адміністрацыі прэзыдэнта. Але ні аднаго, ні другога не дачакалі. Слабым суцяшэньнем былі ўкраінскія дыпляматы ды прадстаўнікі беларускіх банкаўскіх колаў. А сярод італьянцаў быў генэральны дырэктар МЗС Італіі др.Люка Біялята і ганаровы прэзыдэнт Дзяржаўнае Рады Італіі Люіджы Фэрарыс.

Італьянцы аптымістычна ацанілі пэрспэктывы развіцьця нашай краіны і будучыню беларуска-эўрапейскіх стасункаў, але заяву Бэрлюсконі аб хуткім уступленьні Беларусі ў ЭЗ яны пракамэнтаваць не пасьпелі, бо частку выкладчыкаў БДУ больш цікавіла палітыка Зьвязу ў дачыненьні да Расеі. Гэта выклікала пратэст з боку студэнтаў, і дыскусіі былі тэрмінова спыненыя перапынкам на каву.

Працягваючы рабіць камплімэнты нашай краіне, прафэсар Фанара з Мэсінскага ўнівэрсытэту разьвеяў ілюзіі што да роўнасьці ў Эўразьвязе. Ня варта думаць, што там скрозь аднолькавы ўзровень жыцьця. Краіны ЭЗ роўныя ў спаборніцтве, але выбывае мацнейшы.

Удзельнікі сэмінару пагадзіліся, што Беларусь можа далучыцца да ЭЗ, скарыстаўшыся «грэцкім варыянтам». Грэцыю пасьля крывавай дыктатуры «чорных палкоўнікаў» прынялі ў 1981 г. у Эўрапейскую супольнасьць, не чакаючы выкананьня ёю эўрапейскіх патрабаваньняў у сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сфэры, каб не дапусьціць яе збліжэньня з савецкім блёкам.

**Язапат Змысла**

КАМЭНТАРЫ

# Кайф ад жыцьця

Неяк госьці з-пад Менску, завітаўшы ў «НН», сьмяяліся: рэдка бываем у сталіцы, дык ледзь не зблудзілі: ехалі на плошчу Незалежнасьці, а трапілі на Леніна. Ужо дванаццаць гадоў у гарвыканкаму, які стаіць непасрэдна над той станцыяй, не даходзяць рукі зьмяніць мэталёвыя літары. А можа, не хапае сродкаў. Ці няма спэцыялістаў. Або не распрацаваны праект. Варыянты славутага «ушла на базу».

Баяцца мяняць без загаду. Вось галоўная прычына. І ня ў тым справа, што адказам на такую ініцыятыву будуць перуны з вул.Маркса, 38. Гаворка пра панічную боязь свабоды. І памкненьне не рабіць нічога, каб не зрабіць штосьці «ня так», — яшчэ ня самая звыродлівая форма тае боязі. Кажуць, у некаторых раёнах перад восеньскім візытам кіраўніка дзяржавы абрывалі з дрэваў лістоту, якая не пасьпела апасьці.

Вось і з Гуманітарным ліцэем так: баіцца Брыгадзін, прымушаючы баяцца Шчарбачэвіч. А тая ў сваю чаргу хацела запалохаць ліцэй. Ды ён узяў і не схацеў баяцца Шчарбачэвіч. Бо калектыў пэдагогаў за 12 гадоў стварыў якасны беларускі брэнд, які шкада аддаць на глум. І ні Брыгадзін, ні тыя, хто над ім, не далі рады. Яны ж чуйна рэагуюць на супраціў, увесь час выпрабоўваюць нас, як кладку нагой — ці ня сьлізка ступаць.

Сёньняшняя ўлада трымаецца не на гіпэртрафаваных органах унутраных справаў, а на адсутнасьці ў беларусаў кайфу ад жыцьця ва ўласнай краіне. Ад таго, што станцыя мэтро завецца «Ракаўская», а слова «незалежнасьць» пішацца празь мяккі знак.

Што тая шыльда ў мэтро, кажуць нам розныя лятучыя галяндцы; чым пераназываць вуліцы ды станцыі, лепей аддаць тыя сродкі ў які дзіцячы дом. Таксама істотная справа, але ад таго, як будуць звацца вуліцы ды станцыі, залежыць, кім вырастуць гадаванцы дзіцячага дому. Грамадзянамі якой дзяржавы будуць сябе вычуваць. Ці будуць сябе вычуваць грамадзянамі ўвогуле. Або ўсё жыцьцё пражывуць у дзіцячым доме, абведзеным дзяржаўнай мяжой.

**Сяргей Мікулевіч**

# Волевыяўленьне

«У Расеі ў найбліжэйшы час ня будзе ніякага рэфэрэндуму», — прамовіў Аляксандар Вешнякоў. На расейскай тэлевізіі поўнай ходай разгортваецца кампанія ўласных выбараў — думскіх і прэзыдэнцкіх. Мочаць у прыбіральнях камуністаў, тэрарыстаў і лібэралаў; для пратэстнага электарату піяраць Жырыноўскага; астатнім трэба соты раз давесьці, што Пуцін — адзіны кандыдат. Расея занятая. Беларусь мае час да наступнае вясны.

У Піцеры, сярод імпэрскае фэерыі, натоўпу замежных гасьцей і заклікаў «Расею — у Эўропу!» (пасьля якіх памятлівага эўрапейца прабіраюць дрыжыкі), Аляксандар Рыгоравіч, напэўна, усё адбымваў, як бы правесьці які-небудзь канстытуцыйны рэфэрэндум толькі ў Беларусі.

Чыноўнікі на месцах нібыта ўжо атрымалі распараджэньне ня браць адпачынку ў жніўні—верасьні; пачалася плянавая зачыстка трэцяга сэктару й прэсы; грамадзкія настроі зандуюцца рэгулярнымі працэкамі інфармацыі, а аналітыкі прадказваюць фармулёўкі пытаньняў і вынікі галасаваньня.

Гульня досыць рызыкоўная: пратэстныя настроі ў грамадзтве вельмі высокія, як у 1994-м, і хопіць неспадзяванае дэтанацыі, каб сытуацыя выбухнула. Ключавая перавага рэжыму — у яго няма ні арганізацыйнай, ні пэрсанальнай альтэрнатывы. Якраз у гэтым моманце і заключаецца пагроза чарговае «элегантнае перамогі».

Рэфэрэндум павінен пераправарыцца ў беларускае *волевыяўленьне* — дзеля гэтага пратэстныя настроі мусяць рэалізаваць нацыянальны рух. Па-першае, трэба аб'яднаць перад рэфэрэндумам найбольшую колькасьць менавіта незалежных сілаў; па-другое, ясна заявіць пра свае амбіцыі — узяць уладу ў краіне пасьля Лукашэнкі; па-трэцяе, вылучыць лідэра й і, нарэшце, арганізаваць кампанію маштабнае агітацыі й адкрытага супраціву для мабілізацыі гіганцкага патэнцыялу незадаволенасьці. Калі рэфэрэндум будзе мець прарасейскі зьмест — зьвязаць Лукашэнку з Расеяй і атакаваць іх абаіх. Калі Лукашэнка вырашыць пагуляць у інтэграцыю з Эўразьвязам, заявіць: «Мы самі гатовыя зрабіць Эўропу ў Беларусі!» — і будаваць альтэрнатыву на максімальных эўранастроях. Задача нацыянальнага руху на такім рэфэрэндуме — выйсьці зь яго адзіным, моцным, з рэйтынгам ня меней за 30% і статусам новай апазыцыі.

Момант сацыяльны: Расея на год практычна выключаная зь беларускіх працэсаў. Амэрыка й Эўропа толькі й чакаюць, каб зрабіць стаўку на альтэрнатыву. А народ гатовы ісьці за тым, хто мае волю й веру. За лідэрам.

Беларускія палітыкі будуць мець падчас рэфэрэндуму цудоўны шанец. Хваля волевыяўленьня можа раскруціць рэальнага нацыянальнага кандыдата ў прэзыдэнты ў 110 разоў лепш, чым любая палаткавая акруга.

Пытаньне толькі ў адным — ці хопіць на гэта ў некага зь цяперашніх лідэраў асабістае *волі*.

**Павал Севярынец**

# Беларускія ўніяты ў Бэльгіі

Першае набажэнства ў новай беларускай грэка-каталіцкай парафіі ў Бэльгіі адбылося 1 чэрвеня. У Антвэрпэн на службу, якую адправіў настаяцель беларускай місіі Ўваскрасеньня Хрыстовага айцец Ян Майсейчык, сабралася больш за паўсотні вернікаў з усіх куткоў Фляндрыі, а таксама зь іншых старон Эўропы. Наведаў набажэнства й апостальскі візытатар для беларусаў замежжа айцец Аляксандар Надсан, дзякуючы куратарству якога ўзьнікла ўніяцкая грамада.

Грэка-каталіцкі прыход паўстаў на ініцыятыву саміх вернікаў-беларусаў, якія жывуць у краіне. А іх там каля сотні чалавек, якія жывуць ня толькі ў Антвэрпэне, але й у іншых гарадох Фляндрыі ды Валёніі. Літургіі часова адбываюцца ў мясцовым рыма-каталіцкім касьцёле. Аднак уніяцкая суполка мае спадзеў, што зь цягам часу храм можа быць цалкам перададзены ёй — абы вернікі наведвалі службы.

**АШ**



ВІТАЛЬ ГІЛЬ, ГС

**На здымку: айцец Ян Майсейчык. Да 2000 г. ён кіраваў праваслаўнай парафіяй у Слоніме. За сваю прыхільнасьць да беларушчыны а. Майсейчык і патрапіў у няласку да царкоўнага начальства ды быў вымушаны зьехаць у Бэльгію.**

# Новы брэнд «Хартыі»

**Сьледам за «новымі апазыцыянэрамі» з палаты прадстаўнікоў стварылі свой каардынацыйны цэнтар і беспартыйныя радыкальныя дэмакраты. 4 траўня ў Менску паўстала новая палітычная арганізацыя — дэмакратычны блёк «Свабодная Беларусь». Яго заснавальнікі робяць стаўку не на партыі, а на асобаў, заяўляюць пра сваю прыхільнасьць да незалежнасьці Беларусі і пра рашучасьць прыйсьці да ўлады шляхам выбараў.**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Зьлева направа: Валеры Шчукін, Ірына Красоўская, Юры Хашчавацкі, Андрэй Саньнікаў, Леанід Малахаў, Валер Дранчук.**

На прэс-канфэрэнцыі «Свабоднай Беларусі», што адбылася ў Музэі Янкі Купалы, былі абнародаваныя найважнейшыя мэты і задачы блёку, а галоўнае — склад кіраўніцтва: Андрэй Саньнікаў, Леанід Малахаў, Валер Дранчук, Ірына Красоўская, Юры Хашчавацкі, Валеры Шчукін і Зьміцер Бародка. Журналістам паведамілі, што яны бачаць толькі частку Рады, а прозьвішчы астатніх яе сяброў стануць вядомыя «з часам». В.Дранчук прызнаўся, што за ім ужо стаяць 50 удзельнікаў экалягічнага руху.

Паводле словаў Леаніда Малахава, мэта блёку — «прыход дэмакратычных сілаў да кіраўніцтва краінай праз выбары». Андрэй Саньнікаў кажа, што блёк ствараецца з асобаў, якія падзяляюць прынцыпы незалежнасьці, а іх партыйнасьць не бярэцца пад увагу. Ён паабяцаў, што будзе зроблена ўсё магчымае, каб выбраць 110 асобаў для ўдзелу ў парлямэнцкіх выбарах. Але ня толькі гэтым будзе займацца «Свабодная Беларусь», у плянах таксама выпрацоўка стратэгіі разьвіцьця нашай дзяржавы, зазначыў Саньнікаў. Ён вёў рэй на прэсавай канфэрэнцыі, адказваў на самыя складаныя ды непрыемныя пытаньні, якія хапала.

Найперш — чым «Свабодная Беларусь» розьніцца ад іншых блёкаў (меўся на ўвазе рух «За годнае жыцьцё»). А.Саньнікаў сказаў, што больш блёкаў у Беларусі ён ня ведае, ды запэўніў, што розьніцу «Свабоднай Беларусі» ад іншых мы пабачым пасьля заканчэньня арганізацыйнага пэрыяду. Ужо ўвосень будуць рыхтавацца «стратэгічныя падыходы да разьвіцьця Беларусі». На пытаньне, ці будзе «Свабодная Беларусь» рэгістравацца, А.Саньнікаў адказаў, што «рэгістравацца дэмакратычным сілам можна пасьля перамогі». Пакуль жа будуць ствараццa каманды і штабы для кандыдатаў.

Неаднойчы на прэсавай канфэрэнцыі закраналася пытаньне пра адносіны блёку з палітычнымі партыямі. Саньнікаў прызнаўся, што «не заўважае ў партыяў жаданьня ісьці на перамовы». Таму засталося няясным, як кандыдаты «Свабоднай Беларусі» будуць дзяліць выбарчыя акругі з партыйцамі ў выпадку, калі на выбары яны пойдуць асобна. Юры Хашчавацкі паспрабаваў выправіць сытуацыю, удакладніўшы, што будзе правільна гаварыць пра «падтрымку блёкам 110 кандыдатаў», якія не абавязкова могуць быць яго ўдзельнікамі. Выглядае так, што кіраўнікі «Свабоднай Беларусі» яшчэ ня вызначыліся з гэтым і шэрагам іншых пытаньняў ды спадзяюцца іх зьняць у будучым, у тым ліку і на перамовах.

Пакуль цяжка сказаць, наколькі моцныя пазыцыі блёку ў рэгіёнах. На канфэрэнцыі ня зь Менску прысутнічаў толькі барысаўчанін Зьміцер Бародка. Ён сказаў, што «ў рэгіёнах людзі даўно аб'ядналіся» і ніякіх падзелаў ды непаразуменьняў там не існуе. Сам Бародка — сябар БНФ і каардынатар «Зубра», але ў блёку не прадстаўляе гэтыя структуры, а выступае самастойна. Магчыма, сьпешны старт блёку «Свабодная Беларусь» выкліканы дзейнасьцю канкурэнтаў з руху «За годнае жыцьцё», якія ў рамках кампаніі па зборы подпісаў імкнуцца ствараць свае структуры ў рэгіёнах краіны.

Новы блёк «Свабодная Беларусь» адразу ж дыстанцыяваўся і ад руху «За годнае жыцьцё», і ад палітычных партый, а таксама ад «Хартыі'97» ды «Зубра». Тым ня менш, большасьць у залі складалі прадстаўнікі менавіта гэтых арганізацый. Пасьпяшаліся ягоныя стваральнікі адхрысьціцца і ад Расеі. Там, паводле словаў А.Саньнікава, «мы ня бачым сур'ёзных сілаў, якія падтрымліваюць дэмакратыю і незалежнасьць Беларусі». Значыць, арыентавацца новы палітычны блёк будзе на Захад. Нездарма Саньнікаў паабяцаў, што «праз шмат гадоў мы ўсе апынёмся ў саюзе, толькі ён будзе называцца Эўразьвяз».

Зьяўленьне «Свабоднай Беларусі» — сур'ёзная заяўка, пра большае пакуль казаць рана. Чым бліжэй будуць выбары, тым большую актыўнасьць будуць выяўляць палітычныя сілы. Ужо цяпер можна прагназаваць як сур'ёзную барацьбу за правы прадстаўляць на выбарах дэмакратычныя сілы, так і далейшае стварэньне кааліцый. Ня выключана, што ўрэшце на выбары ўсё ж выйдзе нейкі адзіны рух, кшталту «Свабодная Беларусь — за лепшае жыцьцё».

**Андрэй Турук**

# Пазьняк мяняе стратэгію

**Пры канцы палітычнага сэзону група сяброў КХП-БНФ падала скаргі ў Вярхоўны Суд на дзеяньні А.Лукашэнкі і дзяржаўных органаў.**

Грамадзянскую ініцыятыву аб прызнаньні несапраўднай Дамовы ад 8 сьнежня 1999 г. аб стварэньні саюзнай дзяржавы пачалі Кастусь Кашэль, Сяргей Папкоў, Генадзь Пляшко, Алег Радзюк, Алесь Чахольскі і Ўладзімер Юхо. 22 траўня яны падалі ў суд скаргі на дзеяньні «вышэйшай службовай асобы і дзяржаўных органаў», што парушылі іх правы, ды пазовы «аб устанаўленьні факту парушэньня правоў і ўстанаўленьні факту несапраўднасьці міжнароднае Дамовы аб стварэньні саюзнай дзяржавы».

Дамова, на думку сяброў КХП-БНФ, парушае Канстытуцыю, бо ператварае ўнітарную Рэспубліку Беларусь у суб'ект іншай саюзнай дзяржавы, стварае «аб'яднаную вайсковую групоўку» з усімі наступствамі і не гарантуе бясьпекі грамадзянам Беларусі. «Сам Лукашэнка ў пасланьні парлямэнту прызнаў, што дамова 1999 г. супярэчыць Канстытуцыі», — кажа С.Папкоў.

Складаць скаргі ў Вярхоўны Суд сябрам КХП дапамагалі юрысты-экспэрты. Ініцыятары дзівяцца, чаму справу аб несапраўднасьці саюзнай дамовы за тры гады не пачалі прафэсіяналы-юрысты, а «ўсе аналітычныя цэнтры маўчалі да гэтага часу». Такі ж закід можна зрабіць і самім палітыкам.

КХП-БНФ ужо распачаў збор подпісаў пад калектыўнай заявай у Вярхоўны Суд. «Хто ж нас абароніць, дзяцей нашых, унукаў, нашу маёмасьць, калі ня мы самі?» — кажа Папкоў. Ён прызнаецца, што выйграць справу не спадзяецца, бо добра ведае нашу ўладу і нашы суды. Асноўная мэта акцыі — запаліць прагай змаганьня як мага больш грамадзянаў, пераканаць іх ня йсьці на магчымы рэфэрэндум. Калі ў судовых інстанцыях Беларусі заяўнікі будуць мець адмоўны вынік, яны зьвернуцца ў міжнародныя структуры. Працэс ужо пайшоў: паперы сяброў КХП-БНФ зь Вярхоўнага Суду «адфутболілі» ў Ленінскі раённы суд Менску.

У звароце Зянона Пазьняка, зачытаным на травеньскім Сойме партыі, ёсьць такія радкі: «Мы ўжо вымушаныя задумвацца аб пераводзе некаторых нашых тупіковых структураў, што існуюць у варунках акупацыйных рэпрэсіяў, на іншы ўзровень палітычнае дзейнасьці. Над гэтым трэба думаць спакойна і сьмела». Магчыма, ініцыятыва сяброў КХП-БНФ — частка новае стратэгіі партыі.

**Алег Тачоны**


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**С.Папкоў (справа) гатовы бараніць незалежнасьць праз суд.**

# Змаганьне

**Яшчэ два тыдні таму выкладчыкі й вучні Гуманітарнага ліцэю рыхтаваліся сабе да выпускных іспытаў і здумаць нават не маглі, якую міну ім рыхтуе Мінадукацыі. Выбухнула яна ў аўторак, 27 траўня, калі стала вядома, што ліцэю даюць новага кіраўніка — ды якога! Абурэньню выкладчыкаў, ліцэістаў і іхных бацькоў не было межаў. Аднак пра ўсё па парадку.**




ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

**30 траўня. Зранку ліцэісты чакалі Т. Шчарбачэвіч на лесьвіцы ў ліцэй. Але марна.**

## Аўторак. Подых навальніцы

Міністар адукацыі Пятро Брыгадзін выклікаў да сябе Ўладзімера Коласа, каб паведаміць, што навучальная ўстанова атрымае дырэктарку — Тамару Шчарбачэвіч (Колас — намесьнік, але на справе кіруе ліцэем, дырэктара ж там няма ад 1998-га). Марнымі выявіліся ранейшыя звароты бацькоў у Міністэрства: прызначце, маўляў, Коласа дырэктарам. Марнымі выявіліся звароты кіраўніцтва ліцэю да чыноўнікаў: наладзьце пераатэстацыю ўстановы і паводле ейных вынікаў разгледзьце кандыдатуру Коласа на пасаду дырэктара.

Ліцэй сёлета атрымаў тры ўдары, кажа Лявон Баршчэўскі. «Па-першае, кепская дэмаграфічная сытуацыя: цяпер менш школьнікаў, чым у папярэднія гады. Па-другое, сямікляснікі, якія прыйдуць да нас, пайшлі ў школу ў 1996 г., калі ў Менску зусім ня стала беларускіх клясаў. У папярэдніх навучэнцаў не было комплексу перад беларускай моваЙ. З новымі будзе цяжэй. Прызначэньне новай дырэктаркі — гэта трэці ўдар, які нам нанесьлі».

## Серада. Шок і жах

Намесьнік міністра адукацыі Казімер Фарына прывёз у ліцэй новую дырэктарку, каб прадставіць настаўніцкаму калектыву. Тамара Шчарбачэвіч паказала сябе адразу не з найлепшага боку. Па-расейску гаварылі да выкладчыкаў і намесьнік міністра, і новапрызначаная дырэктарка. На заўвагу пра кепскае валоданьне афіцыйнай мовай ліцэю спн.Шчарбачэвіч амбітна заявіла, што дзьвюхмоўя ў краіне «ніхто не адмяняў».

Пытаньні настаўнікаў, адрасаваныя і К.Фарыну, і Т.Шчарбачэвіч, завісьлі ў паветры без адказу. Чыноўнік зазначыў, што новую дырэктарку ліцэю абралі зь дзесяцёх кандыдатаў. Чым Міністэрства адукацыі не задаволіла кандыдатура Ўладзімера Коласа? Фарына ўхіліўся ад адказу: «Я не вырашаю кадравых пытаньняў».

Ягоная ж крэатура наагул адмовілася гутарыць з калектывам: «Мы з вамі зладзім нараду на наступным тыдні, там пра ўсё і пагаворым». На просьбу выкласьці сваю праграму кіраваньня ліцэем Т.Шчарбачэвіч адказала гэткай самай адмовай. Можна меркаваць, што яна папросту не рыхтавалася да сустрэчы. Бо пра ліцэй, якім сабралася кіраваць, ня ведала нічога — аж да адрасу. Не ўяўляла, што лекцыі тут чытаюць кандыдаты й дактары навук. Зьдзівілася й калі пачула, што кіруе ліцэем Рада, куды ўваходзяць вучні, іхныя бацькі ды настаўнікі. «Як Вы на пасадзе дырэктаркі будзеце праверыць узровень заняткаў у Л.Баршчэўскага, які свабодна гаворыць на 6 мовах, ці ў У.Шатона, які валодае 32 мовамі? Ці ў В.Сёмухі, які пераклаў Біблію?.. Колькі замежных моваў Вы ведаеце?» — пасьля такіх пытаньняў у Т.Шчарбачэвіч ад зьдзіўленьня выцягваўся твар.

Сьпярша Л.Баршчэўскі, а потым і іншыя пэдагогі выказалі недавер дырэктарцы. Пасьля «гарачай» сустрэчы з калектывам Т.Шчарбачэвіч не захацела гутарыць яшчэ й з бацькамі ліцэістаў: на сход у той вечар яна не зьявілася.

## Чацьвер. «Пайшла ты, любая, пад гоман жоўтых сосен...»

Ад самае раніцы бацькі занесьлі дырэктарцы заяву свайго сходу й запрасілі прыйсьці на новы сход увечары. Запрасілі без асаблівае надзеі (што потым і пацьвердзілася). Т.Шчарбачэвіч з бацькамі размаўляла толькі па-расейску ды адмаўлялася пакінуць сваю пасаду. «Факт зьдзейсьніўся», — заявіла яна.

Аднак пазьней самаўпэўненасьці ў яе паменела. Зачыніўшыся ў бухгальтэрыі, спн.Шчарбачэвіч прасядзела паўдня: хавалася ад журналістаў. Ліцэісты, калі прыйшлі запрасіць дырэктарку на сустрэчу з сваёй Радай, знайшлі яе між шафамі. Яна пагадзілася прыйсьці на наступным перапынку, але падманула: пасьля сыходу вучняў зьехала зь ліцэю. А навучэнцы тым часам разьвесілі па ўсім будынку плякаты ў абарону ліцэю: «У.Коласа — у ліцэй Я.Коласа», «Уладу — заснавальнікам цяпер і назаўжды». Па-новаму гучала колішняя перадвыбарная налепка «Голас да голасу як колас да коласа».

Увечары бацькоўскі сход пастанавіў: спн.Шчарбачэвіч ня мае права называцца пэдагогам і кіраваць ліцэем. Словам, будзеце праходзіць міма — праходзьце...

## Пятніца. Першая перамога

Навучэнцы прыйшлі ў ліцэй загадзя (а 8.30) і паселі на прыступках

## Сяргей Занкевіч: «Мы яе ня пусьцім!»



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Хоць у ліцэі вучацца сын Вінцука Вячоркі, дочкі Зьмітра Бандарэнкі, Людмілы Гразновай, не палітыкі ўзначалілі пратэст бацькоў, каб не палітызаваць абстаноўку. Кіраўніком ініцыятыўнай групы стаў Сяргей Занкевіч, 49-гадовы бухгальтар. Ягоны сын Зьміцер сканчае першы курс.

**«НН»: Ці бацькі гатовыя прыняць іншага дырэктара, калі Міністэрства адмовіцца ад спн.Шчарбачэвіч?**

**Сяргей Занкевіч:** Гэта залежыць ад кандыдатуры. Але ў нас ёсьць цьвёрдае перакананьне, за якое мы неаднойчы галасавалі: павінен быць прызначаны Ўладзімер Колас. Ён стаяў ля вытокаў ліцэю, працаваў тут 12 гадоў — яму кіраваць і надалей.

**«НН»: Сп.Брыгадзін на сустрэчы з бацькамі 30 траўня абяцаў абмеркаваць праблему наноў на міністэрскай нарадзе 2 чэрвеня. Ці быў ужо адказ на зварот бацькоў ліцэістаў?**

**С.З.:** Міністэрства, паводле закону, мае месяц, каб адказаць на пытаньне. Гэтая праблема абмяркоўвалася, але да канчатковага рашэньня там яшчэ не прыйшлі. У пятніцу кіраўніцтва ліцэю выклікаюць у Міністэрства.

Былы міністар Васіль Стражаў казаў, што ягонае імя ніколі ня зьвяжуць з разбурэньнем ліцэю. Няўжо Пятро Брыгадзін і ягоны намесьнік Казімер Фарына хочуць, каб на іхным гонары, на іхнай рэпутацыі была такая пляма?

**«НН»: Што бацькоўскі камітэт зьбіраецца рабіць далей?**

**С.З.:** Бараніць ліцэй любымі магчымымі сродкамі ў межах закону. Але наконт спн.Шчарбачэвіч хачу падкрэсьліць: гэта вораг усяго беларускага, некампэтэнтны чалавек. Ёй тут ня месца, і мы яе ня пусьцім на парог ліцэю. Хай нават і блізка не падыходзіць!

**Гутарыў АШ**



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

**Тамара Шчарбачэвіч ня любіць фатаграфавацца**

# за Ліцэй




каля ўваходу: чакалі новую дырэктарку. На шырокай лесьвіцы застаўся вузенькі праход — як аднаму ўзьняцца. Настаўнікаў і бацькоў віталі воплескамі — Васіль Сёмуха дзеля гэтага зайшоў двойчы. Дырэктарку да пачатку заняткаў не дачакалі ды мусілі разысьціся па клясах. Т.Шчарбачэвіч зьявілася а палове на 12-ю ды адразу вырашыла паказаць, хто ў хаце гаспадар. Выклікала намесьніцу па гаспадарчай частцы Т.Жыліч і дала два загады. Першы: набыць дзяржаўную сымболіку. Другі: у двухтыднёвы тэрмін падрыхтаваць для дырэктаркі адрамантаваны кабінэт. Пачуўшы пра адсутнасьць грошай на гэтыя мерапрыемствы «першай неабходнасьці», дырэктарка ўзялася за настаўнікаў: выклікала па адным да сябе і адкрыта «наяжджала». Вынікам стаў тэрміновы сход калектыву, які выказаў Т.Шчарбачэвіч недавер. Ліцэісты, каб падтрымаць настаўнікаў, прыйшлі пад дзьверы бухгальтэрыі, дзе «заняла абарону» дырэктарка, і паселі на падлогу, заняўшы ўвесь калідор. У хуткім часе зьявілася гітара і загучалі гімн ліцэю, «Тры чарапахі», «Простыя рэчы», потым іншыя песьні.

У ліцэй прыехалі дэпутаты групы «Рэспубліка» В.Фралоў, У.Парфяновіч, С.Скрабец, начальнік упраўленьня сярэдняй адукацыі У.Шчэрба і галоўная інспэктарка Мінадукацыі Т.Саўчук.

Як зазначыў У.Парфяновіч, для ліцэю выйсьце было толькі адно — салідарнасьць. Менавіта яе дэманстравалі ў гэтыя дні ліцэісты, іхныя бацькі й настаўнікі. Салідарнасьць дапамагла ім здабыць і першую перамогу: Т.Шчарбачэвіч выправілі на трохтыднёвыя курсы падвышэньня кваліфікацыі.

Увечары на бацькоўскім сходзе былі агучаныя зьвесткі, атрыманыя з папярэдніх месцаў працы новай дырэктаркі. Яны ня радавалі.


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Уладзімер Колас

### Субота. Замірэньне і санэпідэмстанцыя

У суботу ў ліцэі празьвінеў апошні званок. У актавай зале, якая апошні тыдзень чула, бадай, толькі гнеўныя філіпікі, гучалі сьпевы і вершы на развітальным канцэрце… А ўвечары на У.Коласа, які вяртаўся дадому пасьля выпускнога вечару, напалі трое маладзёнаў. Яны не чакалі, што кіраўнік ліцэю пачне адбівацца, таму пасьля кароткай бойкі ўцяклі, прыхапіўшы з сабой ягоны мабільнік. Сам У.Колас пакуль не зьвязвае напад на яго ні з сытуацыяй вакол ліцэю, ні з сваёй грамадзянскай пазыцыяй. Аднак выглядае гэты напад занадта «своечасовым», каб быць простым выпадкам.

Ад панядзелка абодва бакі ўзялі тайм-аўт на час іспытаў у ліцэі. У.Коласу і ягоным аднадумцам у гэтай барацьбе будзе цяжэй, бо на іх могуць уплываць ня толькі міністэрскія чыноўнікі. Так, ужо ў чацьвер у ліцэй прыйдзе праверка з санэпідэмстанцыі: у гэтай структуры ёсьць прэтэнзіі да выгляду будынку.

Улады будуць надалей ціснуць на ліцэй, каб пераламіць сытуацыю на сваю карысьць. Ужо сёньня вымалёўваюцца тры магчымыя стратэгіі.

Першая: праз тры тыдні спн.Шчарбачэвіч пачынае выконваць абавязкі дырэктара. Ліцэісты на той час здадуць іспыты і пераважна разьедуцца зь Менску. Іхных бацькоў будуць турбаваць лецішчы ды адпачынкі.

Другая: на зьмену цяперашняй дырэктарцы Мінадукацыі прышле кагосьці іншага — зь лепшай беларускай мовай, больш абазнанага ў справах ліцэю, але больш паслухмянага, чым У.Колас.

Трэцяя: установу перададуць у падпарадкаваньне ГУА. Пасьля гэтага ўсе стаўкі ў ліцэі, а таксама ўсіх настаўнікаў будуць зацьвярджаць там. У такі спосаб ліцэй будзе разбураны знутры.



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

«Насьценная» агітацыя выклікала найбольшае абурэньне міністэрскіх чыноўнікаў

Бацькі й настаўнікі гатовыя адстойваць свой ліцэй да апошняга: апрача ўсіх заяваў у Мінадукацыі й пракуратуру, яны падалі яшчэ заяўку на пікет.

Пазыцыя Міністэрства загадзя выглядае маральна пройгрышнай. Прызначэньне Т.Шчарбачэвіч паказала, што падбор кадраў у Міністэрстве вядзецца некампэтэнтнымі асобамі. (А як інакш вытлумачыць, што прызначаная ў беларускі ліцэй кіраўніца ня ўмее гаварыць па-беларуску?) Цень некампэтэнтнасьці кладзецца і на самога міністра. Ясна, што не ягоная справа — правяраць кожнага прызначанага дырэктара сярэдняй навучальнай установы. Але ж загад пра прызначэньне спн.Шчарбачэвіч падпісваў менавіта Пятро Брыгадзін. І ён ня мог ня ведаць, чым ёсьць Нацыянальны ліцэй.

Ліцэй паказаў, што ён можа «трымаць удар». На яго баку — маральная перавага. На яго баку — права на навучаньне на роднай мове, гарантаванае законамі краіны. Ужо цяпер настаўнікі, ліцэісты і бацькі гатовыя заставацца ўсё лета ў Менску, каб адстойваць гэтае сваё права.

**Аркадзь Шанскі**

КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ

## Карпаратыўны наступ бюракратыі

За гвалтам міністэрства адукацыі ў Гуманітарным ліцэі стаяць ня столькі палітычныя, колькі бюракратычныя матывы.

Першы матыў — чыноўнікі ратуюць свае пасады. Акт міністра Брыгадзіна трэба разглядаць у адным шэрагу з актамі міністра культуры (забарона бібліятэкам выпісваць недзяржаўныя газэты) і міністра інфармацыі (закрыцьцё «БДГ»). Тры ідэалягічныя міністры, кожны на сваёй дзялянцы, робяць тры вернападданскія і паказушныя ўчынкі. Кожны ў сваёй сфэры абраў аб'ект для максымальнага розгаласу. Дзеяньні іхныя рэфлектoрныя, як у часе агоніі. Відаць, нехта зьверху капітальна напалохаў міністраў новай прэзыдэнцкай ідэалёгіяй. Адно каб, ратуючыся, яны не нарабілі шкоды. А гэтага ня будзе, калі аб'екты рэпрэсіяў выстаяць. І найперш мусіць выстаяць Ліцэй, на які незалежнае беларускае грамадзтва глядзіць сёньня, як год таму — на Курапаты і іх абаронцаў. Тады беларускі агмень гарэў там, цяпер ён тут.

Другі матыў — шырэйшы. Гэта карпаратыўны наступ бюракратыі. Ліцэй рэзка вылучаецца сярод менскіх школаў ня толькі сваёй беларушчынай, але й тым, што там не ўчыняюць пабораў з бацькоў і ня плацяць за ацэнкі. Школьная карупцыя стала ледзьве не татальнай і квітнее, ясная рэч, з маўклівае згоды ведамства спадара Брыгадзіна. Ліцэй жа парушае «норму», у параўнаньні зь ім школьная карупцыя выглядае злачынна. Зразумела, што бюракратыі сьвярбіць пазбавіцца такога параўнаньня. І тут ужо праблема не ў асобе міністра (пра якога заўтра ніхто ня ўспомніць), а ў цэлай арміі хабарнікаў на вялікіх і малых пасадах. Ім можа супрацьстаяць толькі грамадзкая салідарнасьць нармальных настаўнікаў, бацькоў і дзяцей.

ВАЧЫМА ЛІЦЭІСТКІ

# Зайздрасьць багоў

Сёлета я пакідаю ліцэй. Яго больш ня будзе ў маіх заплаканых падушках і позьніх тэлефонных размовах, яго больш ня будзе кожную раніцу а 9-й, цяпер ён будзе глядзець на мяне дваццацьцю вачыма з выпускнога фатаздымку на маёй сьцяне. Ён будзе мне сьніцца і нагадваць пра чатыры гады безупыннага, бессаромнага, безумоўнага шчасьця, непадобнага да традыцыйных школьных гадоў з пэрыядам перарастаньня падлеткавых комплексаў у дарослую форму невылечнай ардынарнасьці. Мы тут былі шчасьлівыя. Гэта такое шчасьце, якое заваёўваецца сотнямі перамог над сабой і ў сабе.

Такое шчасьце, якога вырашаюць не пакідаць цяперашнім першакурсьнікам і тым, што будуць налета. Вырашаюць не пакідаць вашым дзецям ці дзецям вашых дзяцей, роўна як і маім. Я ня ведаю, ці захачу нараджаць дзяцей у краіне, дзе пазбаўляюць права на шчасьце. Можа быць, Спадарства Найвышэйшыя Органы, на якое сёньня не ўплываюць нават самыя вычварныя мэтады пратэсту, прыслухаецца да «нізоў», калі, не такія ўжо і бясьсільныя, мы перастанем нараджаць Ім новых людзей. Дарагія маладыя яшчэ ня мамы! Дэмаграфічная сытуацыя — гэта Іх праблема. А Яны ня дбаюць пра нас.

У мой Ліцэй, дзе я была шчасьлівым чалавекам у стадыі дарасьленьня, Нехта, вельмі дасьведчаны ў справах чужых шчасьцяў, прызначыў новую дырэктарку. Нічога вонкава не зьмянілася. Апрача сьлёз моцных духам выкладчыц, плякатаў «Не вырывайце нам сэрца!» і песень ліцэістаў, што сядзелі на падлозе перад навасьпечаным пакоем новапасаджанай пэрсоны зь не па-дырэктарску драпежным позіркам, — усё тут як заўсёды. Як заўсёды, грыміць Апошні званок і выпускніцы засынаюць валасы адна адной пацеркамі сьлёз. Як заўсёды, пачынаюцца іспыты, і крэмы для загару разам з вакацыйнымі ўборамі не сьпяшаюць даставацца з шафаў.

Ліцэісты вучацца, іх бацькі штодзённа зьбіраюцца на сходах і складаюць усё новыя лісты да кіраўніцтва, спадзеючыся, што Нехта іншы, зь белымі крыламі, дапаможа перажыць гэты час драматычнага абсурду і зьнясе на сваіх белых крылах пэрсону з драпежным позіркам ці яшчэ кагo заўгодна, хто захоча паквапіцца на чужое шчасьце...



Мы вельмі любім гэты ліцэй. Мы любім свайго дырэктара, мы любім сваіх выкладчыкаў, мы любім быць разам, мы любім усё такім, якое яно ўжо ёсьць. І нікому тут ня трэба нічыёй дапамогі. Хтосьці прыйдзе праз год, каб быць шчасьлівым, як былі шчасьлівымі мы. Мы ж будзем вяртацца сюды днём і ў ліпёвых начных кінафільмах, мы будзем вечна ісьці сюды, каб не паразгубляць свайго шчасьця, каб зноў знайсьці ўсё, спадкаванае па сваіх месцах. Можа быць, Нехта проста вельмі зайздросьціць нам? Зайздрасьць — кепскае пачуцьцё, зь ім вечнага жыцьця не пражывеш...

**Адэля Дубавец**

# Рэстаўрацыя балота




Нам, беларусам, яшчэ грэх скардзіцца на мэліярацыю, бо яна не пасьпела зусім зьнішчыць тры нізінныя балоты, самыя вялікія ў Эўропе: Званец, Спораўскае і Дзікае. У Нямеччыне тая ж мэліярацыя была больш пасьпяховай, і іх нізінныя балоты даўно сталі сельскагаспадарчымі палеткамі. Тая ж вяртлявая чарацянка раней лётала над балотамі Нямеччыны, а цяпер яе можна пабачыць толькі на Званцы (Драгічыншчына) і Беларускім тэлебачаньні. Мо таму замежнікі й неабыякавыя да нашых прыродных багацьцяў — настальгія...

Каб выратаваць рэдкія віды птушак, зьвяроў ды расьлінаў, што яшчэ захаваліся на Званцы, грамадзкае аб'яднаньне «Ахова птушак Беларусі» зьвярнулася па дапамогу ў Вялікую Брытанію, да Каралеўскага таварыства абароны птушак. Там і выдаткавалі сродкі на аднаўленьне балота. Да канца году на каналах, якія акаляюць Званец, будзе збудавана 9 дамбаў агульным коштам у 40 тыс. даляраў. Цікава, што іх узьвядзеньнем займецца Берасьцемэліявадгас — тое самае прадпрыемства, якое ў 70-я асушала балота.

Сваю назву Званец атрымала ад бзюмканьня інсэктаў, якіх тут вялікае мноства. Спэцыялісты па птушках доўга спрачаліся, што ж гэта за кузуркі такія «з прыгожымі зялёнымі вачыма» — авадні, сьляпні ці маскіты, але так і не прыйшлі да супольнага меркаваньня. Энтамолягаў у Таварыстве, на жаль, няма.

Для жыхароў навакольных вёсак (а гэта каля трох тысячаў чалавек) аднаўленьне балота — вялікая радасьць. Бо асушанае, яно паводзіцца непрадказальна: сёлета яго затапіла, а летась на тарфяніштах шугала полымя. Людзі наракаюць, што мэліярацыя зьнішчыла ўсю тутэйшую фаўну: не вядуцца ласі, казулі, качкі. Дый сам факт, што іхнае балота вывучаць замежныя экспэрты, дадае жыхарам гонару.

Да мэліярацыі тут вёўся зусім іншы лад. Да канца 50-х навокал стаялі шматлікія хутары, на балоце, багатым краскамі-меданосамі, квітнела бортніцтва. Цяпер зямля кругом калгасная, хоць ёсьць крыху і людзкіх сотак. Каля 10% плошчы выкошваюць.

Шкада, што ў нас ніколі не існавала закону, які забараняе мяняць характар зямлі. У Амэрыцы, напрыклад, зямлю можна вольна набываць і прадаваць. Аднак калі вы набылі балота, дык ня маеце права асушаць яго ды перарабляць на палеткі. Але і без таго закону нашыя балоты — нязломная сіла. Нават цяпер, калі Званец асушаны, да людзкіх сенакосаў не дабрацца: топка. Як гэта робяць мясцовыя жыхары — для навукоўцаў загадка. Балота жыве сваім жыцьцём.

Праект захаваньня Званца прадугледжвае ня толькі ўзнаўленьне яго гідралягічнага рэжыму, але і кантроль за гаспадарчай дзейнасьцю на балоце пасьля аднаўленьня. Цяпер Званец мае статус заказьніка. Гэта не прадугледжвае ніякіх кантрольных органаў, ёсьць толькі правілы карыстаньня заказьнікам, выкананьня якіх ніхто не кантралюе. Браканьерства, высечка лесу, выпас жывёлаў — гэта жыцьцё балота сёньня. Таму «АПБ» разам з абласным камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяродзьдзя зьбіраецца стварыць «цэнтар кіраваньня балотам»: некалькі чалавек будуць стала жыць пры Званцы і сачыць за ім.

Паводле словаў міністра прыродных рэсурсаў і навакольнага асяродзьдзя Лявонція Харужыка, бліжэйшым часам плянуецца стварэньне транснацыянальнага экалягічнага рэзэрвуару, куды ўвойдзе Прыбускае Палесьсе Беларусі (Берасьцейскі і Маларыцкі раёны), Шацкі нацыянальны парк Украіны ды Прыбускае Палесьсе Польшчы.

Наступнае ж балота, якое мае аднаўляць Мінпрыроды, — Дзікае, што месьціцца на тэрыторыі Белавескай пушчы.

**Вераніка Дзядок, АШ**

ЯНЫ ВЯРТАЮЦЦА

# Генадзь Лех



**Вярнуцца на Бацькаўшчыну пляную Генадзь Лех, адзін з самых вядомых беларускіх дзеячоў-незалежнікаў у Расеі.**

Доктар тэхнічных навук, старшыня «Грамады беларускай культуры імя Ф.Скарыны», кіраўнік «Міжрэгіянальнага аб'яднаньня беларусаў Расеі». Гэта ўсё Лех. Яму 39 гадоў, ён паходзіць з Магілёва. Туды ж цяпер хоча вярнуцца.

Генадзя Леха я адшукаў па тэлефоне ў Магілёве, дзе ён будуе свой дом. «Магілёў — гэта мая радзіма, а ў Менск я не хачу, — кажа Г.Лех. — Празь некалькі гадоў перадеу ў Беларусь. Можа, тут нешта палепшыцца».

У Маскве Генадзь Лех працуе дырэктарам фірмы, якая выраблае алюміневыя і тытанавыя паўфабрыкаты. Шмат часу і сілаў прыкладае для арганізацыі беларускай грамадзка-культурнай дзейнасьці. Так, у сакавіку—красавіку ў Маскве была арганізаваная выстава мастака Алеся Пушкіна, прысьвечаная ўгодкам БНР. Паводле словаў Леха, па будынку, дзе яна праходзіла, цэлы месяц віселі чатыры бел-чырвона-белыя сьцягі.

А яшчэ Лех — ад 1997 г. сябра Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, зьяўляецца яе прадстаўніком у Расеі. Адным пэрспэктыўным палітыкам-незалежнікам у нас пабolee.

**Сяргей Ёрш**

## Анархія ў Жэнэве

**Кіраўніцтва швайцарскай паліцыі ня ведае, радавацца яму ці рваць на галаве валасы.** З аднаго боку, паліцыі ўдалося дасягнуць найважнейшай мэты: нядзельная антыглябалісцкая маніфэстацыя, у якой узялі ўдзел пад 80 тыс. чалавек, прайшла спакойна. Зь іншага боку, паліцэйскія спасавалі перад некалькімі сотнямі анархістаў-экстрэмістаў, якія дзьве начы запар грамілі вуліцы Лязаны і Жэнэвы: білі вітрыны, спусташалі крамы, нішчылі аўтамабілі і атакавалі грамадзкія будынкі.

Страты нанесеныя велізарныя: папярэднія падлікі паказваюць, што толькі замена пабітых шыбаў у Жэнэве будзе каштаваць за 500 тыс. даляраў! І гэта нягледзячы на тое, што Швайцарыя выдаткавала на бясьпеку падчас саміту «вялікай васьмёркі» каля 30 млн даляраў. Паліцэйскія шчыра прызнаюцца, што сытуацыя выйшла з-пад кантролю: «Мы былі гатовы да сутычак з маніфэстантамі, але не да барацьбы з дробнымі і выдатна арганізаванымі групамі вандалаў».




У Жэнэве

## ЗША перадысьлякуюць войскі

**ЗША рыхтуюць самую маштабную з часоў другой сусьветнай вайны перадысьлякацыю сваіх войскаў за мяжой.** Яны істотна скароцяць сваю ваенную прысутнасьць у Нямеччыне, Паўднёвай Карэі і на японскім востраве Акінава. Як стала вядома з амэрыканскіх крыніцаў, у адміністрацыі Буша ідуць актыўныя дыскусіі што да ўзмацненьня вайсковай прысутнасьці ЗША на Ўсходняй Эўропе (гаворка йдзе пра Польшчу, Румынію і Баўгарыю). Таксама абмяркоўваецца магчымасьць стварэньня новых базаў у Паўночнай Аўстраліі, на Філіпінах і ў Віетнаме.



Амэрыканцы — скрозь?

## Едзе Літвін — мяняй карасін

**Самалёт з дэлегацыяй украінскай Вярхоўнай Рады, якая вярталася зь Японіі, амаль 15 гадзінаў прастаяў у аэрапорце расейскага Хабараўску.** Пілёт запатрабаваў ад лётных службаў замяніць паліва. На думку пілёта, расейцы залілі газу кепскай якасьці: яна магла замерзнуць у паветры і прывесьці да аварыі рухавікоў. Дырэкцыя аэрапорту прызнала, што паліва было дрэнным. Пасьля драматычных перамоваў газу замянілі, а расейскае МЗС папрасіла прабачэньня за інцыдэнт. Пасажырамі «Іл-62» былі кіраўнік украінскага парлямэнту Ўладзімер Літвін, некалькі дзясяткаў дэпутатаў і журналістаў.

## Ня стала кардынала Калязона

**У Італіі ва ўзросьце 78 гадоў памёр кардынал Франчэска Калязона, колішні пасол Ватыкану ў Савецкім Саюзе.** У многім дзякуючы яму ў краінах былога сацлягеру адрадзілася каталіцтва. Век Калязона дажываў у сваім доме ў Пулі на поўдні Італіі. Папа выказаў спачуваньне сваякам кардынала.



Уладзімер Літвін

## Першае муляня

**У ЗША ў штаце Айдаха нарадзіўся першы кланаваны мул, якога назвалі Кляйнодам Айдаха.** Для кланаваньня вучоныя выкарысталі плод мула, а вынасіла яго кабыла. Вынік экспэрымэнту ўнікальны, бо мул — гэта гібрыд асла і каня, і ў прыродзе ён бясплодны.



Побач з жарабятамі ды асьлянятамі будуць пасьціся і муляняты

## Помнік сабаку

**У Тальяцці (Расея), дзе робяць «Жыгулі», у нядзелю быў адкрыты помнік пад назвай «Адданасьць».** Ён увекавечыў сабаку, які сем гадоў не пакідаў месца, дзе ў часе аўтамабільнае аварыі загінуў гаспадар. Людзі, спачуваючы, хацелі прытуліць жывёліну, але сабака не даваў зваблць сябе ніякімі прысмакамі, пакуль сам не памёр. Сабака на помніку стаіць ля шашы і ўглядаецца ў аўтамабілі, што яго мінаюць. Паставілі манумэнцік за кошт жыхароў Тальяцці.

## Палкоўнікі ў дваранстве

**Усерасейскі Геральдычны калегіюм хоча адрадзіць дарэвалюцыйную традыцыю, згодна зь якой кожны, хто дайшоў да рангу палкоўніка, аўтаматычна атрымліваў герб.** Палкоўнікаў у Расеі сёньня пад сто тысячаў. Да гэтай лічбы трэба дадаць столькі ж чыноўнікаў высокіх рангаў (адпаведнікам палкоўніка ў цывільнай службе зьяўляецца кіраўнік аддзелу ў дзяржадміністрацыі). Сёньняшняя Расея ўсё часцей запазычвае традыцыі царскай эпохі, таму ідэя аўтаматычнага наданьня дваранства вышэйшым афіцэрам і чыноўнікам можа быць падтрыманая. І нікога не хвалюе тое, што новыя ягамосьці мусяць станавіцца навыцяжку пад гімн СССР. Ёсьць і яшчэ адна праблема: складаньне генэалягічнага дрэва і наданьне гербу каштуе пад тысячу даляраў. А палкоўнік зарабляе каля дзьвюх сотняў.

**СП**

# На Гарадзеншчыне 72 фронтаўцы

**Трынаццаць палітычных партый, пастаўленых на ўлік у Гарадзенскай вобласьці, агулам налічваюць 8683 сяброў. Усяго ў вобласьці каля 1200 тыс. жыхароў.**

Найбольшая партыя Гарадзеншчыны — Аграрная (5543 сябры). Пасьля «пераабраньня з пасады» старшыні абласной арганізацыі Мечыслава Гіруцкі, АП зрабілася выяўна праўрадавай. Дзевяць яе сяброў безальтэрнатыўна абраныя ў аблсавет. І якія людзі! Першы намесьнік старшыні аблвыканкаму, старшыня абласнога камітэту па сельскай гаспадарцы і харчаваньні Іван Данчанка, яго ж першы намесьнік Мікалай Пахалок, старшыня калгасу імя Леніна (Навагрудчына) Уладзімер Дзяшук, старшыня аблсавету Аркадзь Карпуць, старшыня абласнога камітэту прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяродзьдзя Мечыслаў Кудырка, дырэктар сельскагаспадарчага прадпрыемства «Мажэйкава» (Лідчына), дэпутат нацыянальнага сходу Казімер Рахатка, гендырэктар «Горадняхлебапрадукту» Хведар Хворык, дырэктар Смургонскага камбікормавага заводу Міхаіл Чуковіч, старшыня калгасу імя Прытыцкага (Бераставіччына) Анатоль Коханаў. Трапілі «аграрнікі» і ў райсаветы: у Ашмянскі — шэсьць чалавек, у Гарадзенскі — адзін, у Зэльвенскі — шэсьць (усе старшыні калгасаў), у Карэліцкі — чатыры, у Сьвіслацкі — адзін, у Слонімскі і Смургонскі — па два... Усяго ў саветах 32 аграпартыйцы.

Лібэральна-дэмакратычная партыя мае ў сваіх шэрагах на Гарадзеншчыне 918 чалавек. Асабліва моцная арганізацыя ў Лідзе. Падчас выбараў у мясцовы гарсавет на 40 дэпутацкіх месцаў ЛДП вылучыла аж 38 сваіх кандыдатаў. Але нікога не абралі.

Партыя камуністаў Беларусі налічвае ў рэгіёне 502 сяброў, адзін зь якіх стаў дэпутатам (начальніца ЖЭСу №21 Горадні Алена Церашчук). Іх калегаў-апанэнтаў з КПБ удвая менш — 260, але яны маюць аж пяць сваіх дэпутатаў.

АГП (242 сябры) у дэпутаты ня здолела правесьці нікога. «Народная грамада» (113) — Ірыну Вештард (Смургонскі райсавет). «Народная згода» (430) — дырэктара гарадзенскай СШ №5 Анатоля Прысяча. Ад БНФ (72 сябры) у Гарадзенскі гарсавет трапіў старшыня Незалежнага прафсаюзу работнікаў «Азоту» Сяргей Антусевіч, а ў Слонімскі райсавет — лекар-траўматоляг Іван Шэга.

Што да Беларускай партыі працы (147 сяброў), Беларускай патрыятычнай партыі (168), БССП (87), дык яны ў Гарадзенскай вобласьці ня здолелі займець сваіх дэпутатаў.

Усяго арганізацыйныя структуры палітычных партый Гарадзеншчыны вылучалі 148 сваіх прадстаўнікоў у саветы ўсіх узроўняў.

**Антон Лабовіч, Горадня**




БПП (1) Беларуская партыя працы
БПП (2) Беларуская патрыятычная партыя




IREX-PROMEDIA

# Камень Драздовіча

Дзякуючы самаахвярнай працы настаўніка расейскай мовы і літаратуры Лучайскай базавай школы (Глыбоччына), краязнаўца Рыгора Шарыпкіна, які папулярызуе гісторыю краю сярод вучняў, знойдзены камень, які згадваецца ў дзёньніках Язэпа Драздовіча пад 1936 г.

Залешчына — край блакітных азёр, высокіх марэнных пагоркаў, тут здаўна сяліліся людзі, якія пакінулі шматлікія гарадзішчы. У археалягічных раскопах шматкроць знаходзяць наканечнікі стрэлаў і дзідаў — сьведчаньні шматлікіх войнаў між каланізатарамі-крывічамі і балтамі. Кожнае возера авеяна паданьнямі. Надзвычай прыгожы край. Гэта і вабіла сюды Язэпа Драздовіча.

У часе адной з сваіх шматлікіх вандровак мастак спыніўся адпачыць між Залесьсем і Лучайкай, пры камені з выявою крыжа, і на дрэве побач выразаў літару «Я». Вучаніца 7-й клясы Лучайскай школы Таццяна Паграбоўская, зьбіраючы ў хваёвым лесе пралескі, знайшла той камень. Узрушаная дзяўчынка адразу ж паімчалася на ровары да свайго настаўніка і паведаміла: «Я знайшла камень, які Вы ўсё жыцьцё марылі адшукаць!»

Зразумела, дрэва зь літарай «Я» празь семдзесят гадоў не захавалася. Зьмяніліся і контуры колішняй дарогі, пры якой стаяў гэты помнік даўніны. Яна цяпер праходзіць воддаль на пяць дзясяткаў мэтраў. Зьмянілася ўсё, застаўся толькі камень, а на ім — «крыж з пакровам» (так ахарактызаваў яго глыбоцкі бацюшка, якому я паказваў выяву).

Праз чатыры дні пасьля знаходкі аўтар гэтых радкоў, супрацоўнік Глыбоцкага гісторыка-этнаграфічнага музэю Алесь Хайноўскі й Рыгор Шарыпкін наведалі гэтае месца. Зьдзіўленьне нашае ня мела межаў. Пад каменем выкапана яма. Побач — камяні ад падмурку. Сама сьвятыня заваленая долу. Кожны марыць знайсьці на бязьлюднай сьцежцы торбачку з грашыма, пажадана зь «зялёнымі». А калі не знойшоў? Трэба «капаць» там, дзе яшчэ ніхто не капаў. Але Драздовіч маляваў карціны, дываны, выразаў скульптуркі — за ежу (аб чым ён часта паведамляе ў сваіх дзёньніках). Торбы з золатам у яго не было, таму і не было чаго закопваць пад гэтым каменем! Паквапіліся «чорныя археолягі» і нічога не знайшлі, толькі спаганілі месца.

Таму 24 траўня вучні Лучайскай базавай школы разам з настаўнікамі зладзілі суботнік для ўзнаўленьня помніка. Упарадкавалі тэрыторыю, камень паставілі выявою крыжа да гасьцінца, вакол помніка выклалі паўкола з палявых камянёў. Засталіся невялікія работы: трэба яшчэ зрабіць агароджу з парэнчаў вакол «каменя Драздовіча».

Вось што хачу сказаць на заканчэньне. Шмат разоў я чуў ад глыбачан: тут ня Латвія і не Літва, не Нямеччына і ня Польшча. Культуры як не было ў нас, так і ня будзе. Годзе плакацца! Хай зробіць кожны з вас, хто плачацца, тое, што робіць вясковы настаўнік Рыгор Шарыпкін. І хай кожны памятае малітву-зварот Язэпа Драздовіча: «Прынясі мне добрыя памысныя варункі жыцьця дзеля працы маёй на карысьць людзём праз навуку, праз прыгожае слова і прыгожыя творы мастацтва».

**Уладзімер Скрабатун, «Вольнае Глыбокае»**



УЛАДЗІМЕР СКРАБАТУН

**На здымку: краязнаўца Рыгор Шарыпкін ля адшуканага «каменя Драздовіча». Напярэдадні тут «папрацавалі» скарбашукальнікі, але безвынікова: скарбу тут ніколі не было.**

## Фота з Радзівілам

**Адзіная ў Беларусі вуліца Радзівілаўская месьціцца не ў Нясьвіжы ці Слуцку — колішніх вядомых магнацкіх гарадах.** Невялічкая (усяго 2 дамы) Радзівілаўская вуліца існуе з 1994 г. у гарадку Барань пад Воршай. І хаця пару гадоў таму пэнсіянэры спрабавалі пераканаць Баранскі гарсавет у неабходнасьці перайменаваньня вуліцы, улады на гэта не пайшлі: памяць пра заснавальнікаў гораду вырашылі шанаваць.

Летась на Радзівілаўскай вуліцы адкрылі памятную дошку з словамі пашаны славутаму магнацкаму роду. Праект гэтага знаку належыць былому дырэктару Баранскага краязнаўчага музэю Віктару Міхасёву.

Наагул жа насельнікі Барані ганарацца сваім заснавальнікам — Крыштапам Радзівілам «Перуном», і памятная дошка не адзіны знак таго гонару. Ад 1994 г. у будынку гарвыканкаму стаіць барэльеф з выявай грознага гетмана, зроблены мясцовым мастаком Уладзімерам Батурам. Усе прыежджыя, паводле словаў В.Міхасёва, з задавальненьнем фатаграфуюцца побач з героем нашай гісторыі.

**Аркадзь Шанскі, Ворша**

## Елкай — па Марксу

**Вось ужо другі год запар у Лагойску працягваецца зьнішчэньне былой прыгажосьці.** Пачыналася гэтая эпапея з высечкі векавых дрэваў, якія нібыта былі хворыя і маглі ў любы момант паваліцца. Дрэвы зьнішчалі ўсе, ня гледзячы на іх стан. Паступова агалілася ўся цэнтральная частка Лагойску. Старыя дрэвы нарэшце скончыліся, і прыйшла чарга маладзейшых.

А нядаўна здарылася вось што. Перад райвыканкамам, за гіпсавымі плячыма Леніна й Маркса, рос радок блакітных елак. Дрэвы нікому не перашкаджалі. Дый камуністычныя правадыры выглядалі на фоне елак не такімі ўжо адыёзнымі. Жывая сьцяна мякка адгароджвала цэнтральную плошчу ад выканкаму, што рабіла пляц прывабным для моладзі, асабліва ўвечары.

У траўні пачалася падрыхтоўка да сьвяткаваньня 925-й гадавіны Лагойску. Чакаецца прыезд вялікай колькасьці гасьцей. І вось нехта палічыў, што елкі ствараць пагрозу бясьпецы падчас сьвяткаваньня. Іх было вырашана зьнішчыць. За справу ўзяліся зь вялікім натхненьнем, 30 траўня з раніцы дрэвы пачалі валіць. Ці, можа, адна з блакітных прыгажунь вырашыла адпомсьціць барбарам, ці гэта была памылка «чалавека зь пілой» — але ў выніку бюст аднаго з павадыроў быў зьнішчаны. Карл Маркс бяз твару, пабіты ляжаў на прыступках свайго пастамэнту. Аўтара «Капіталу» хуценька зьвезьлі ў невядомым кірунку, а сярод тых, хто ўбачыў пусты пастамэнт, папаўзьлі чуткі, што на гэтым месцы неўзабаве паставяць новы помнік... Як вы думаеце, каму?

**Фронтавец, Лагойск**

## Miadźviedzi jduć



**Letaś «NN» užo pisała pra miadźviedzia, ślady jakoha bačyli la vioski Bahušy Baranavickaha rajonu.** Sioleta la toj samaj vioski błukaŭ jašče adzin taki źvier. Jahonyja ślady krychu mienšyja za minułahodnija. Ciapier miadźviedziu niešta spatrebiłasia na ziamli sadovaha tavarystva. Jon adłamaŭ štakietnik ad aharodžy, paciahaŭsyia pa sotkach, syšoŭ u les. Samoha źviera pakul nichto na vočy nia bačyŭ. Niebiaśpiečna robicca ŭ navakolnych lasach vioski Bahušy.

**Rusłan Raviaka, Baranavičy**

## Novyja śviatary dlia Haradzienščyny

**U niadzieliu 1 červienia svaju pieršuju imšu ŭ vaŭkavyskim kaściole Šv.Vaclava adpravili ks.Aleksandar Bakłažec i Siarhiej Jakimovič.** Pry kancy nabaženstva jany asabista błaslavili kožnaha prysutnaha. Śviatarskija paśviačeńni ksiandzy atrymali 24 traŭnia ŭ haradzienskaj Katedry z ruk biskupa Aleksandra Kaškieviča. Uvohule ž za hady dziejnaści Vyšejšaj duchoŭnaj seminaryi ŭ Horadni jaje skončyli 11 našych ziemlakoŭ. Dziesiać ź ich užo stali śviatarami, a adzin źjaŭlajecca dyjakanam.

**Alena Kanapielka, Vaŭkavysk**

## 6 чэрвеня пятніца

### ● БТ

6.00, 7.00, 9.00, 12.00, 15.00, 17.35, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.00 «Паварот ключа». Сэрыял. Заключная сэрыя.
8.50 Выпускны экзамэн па беларускай і расейскай мовах за курс базавай школы ў агульнаадукацыйных і спэцыяльных установах.
9.10, 16.45 «72 гадзіны». Сэрыял.
10.00 Сад мары.
10.30 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
10.55 Падарожжа дылетанта. «Жупраны. Край зуброў».
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.45 Добры дзень, Беларусь!
13.05 Маст. фільм «Высакародны разбойнік Уладзімер Дуброўскі» («Беларусьфільм»).
15.15 «Вакол шпіёны». Анімацыйны сэрыял.
15.40 Прыгодніцкі фільм «Бронзавая птушка» («Беларусьфільм»). 1-я сэрыя.
17.55 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Моладзевыя каманды. Адборачны матч. Беларусь—Галяндыя. Жывая трансьляцыя з Барысава.
20.05 Трэці тайм.
20.20 Сусьветная калекцыя кароткамэтражных фільмаў. «Свой мэтад».
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 «Сола для саксафона». Канцэрт Аляксандра Сярова.
0.10 Камэдыя «Пісталет з глушыцелем».

### ● СТВ

6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
7.20. 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.35 «24 гадзіны».
7.50 «СТВ-спорт».
8.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.5. 18.20 «Менск і менчукі».
8.10, 22.55 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: баявік «Паліцэйская гісторыя-2».
10.00 «Турпаход».
10.10, 23.20 Праект «Адлюстраваньне»: «Бамонд». Дак. фільм.
10.55, 20.30 «Аўтапанарама».
11.10 «Тэатральныя гісторыі».
11.25 «Народ супраць». Тэлегульня.
12.00 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.55 «Чыста па жыцьці». Сэрыял.
13.50, 18.35 «Тайны знак». Тэлесэрыял.
14.40 «Малыш і Карлсан». Мультфільм.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.15 Кіно: кінараман «Вечны пакліч».
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.25 «Тэма дня».
20.00 «Рэактыўны бокс».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: камэдыя «Пераключаючы каналы». ЗША, 1988.
23.05 «Навіны СНД».
23.20 «Аблічча новага стагодзьдзя». Конкурс прыгажосьці-2002.
0.30 Кіно: баявік «Мёртвая хватка». ЗША, 2001.

### ● Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік».
9.00, 16.00 Рухач.
14.00 «V.I.P.онія».
17.00, 19.40, 22.10 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
22.00 «120/80».
22.30 «20-ка Першых».
23.30 МэгаМікс.

### ● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.35 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Шматсэрыйны фільм «Па той бок ваўкоў». Заключная сэрыя.
10.45 Дак. дэтэктыў «Бяз тэрміну даўнасьці». «У пошуках згубленага мангальф'ера».
11.10, 22.10 «Фабрыка зорак-2».
11.40 Сэрыял «Твінісы».
16.00 Шматсэрыйны фільм «Дасье дэтэктыва Дуброўскага». Заключная сэрыя.
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 Дак. фільм. «Танец з шаблямі». Да 100-годзьдзя Арама Хачатурана.
18.35 «Самі з вусамі».
20.00 Час.
21.00 «Поле цудаў».
23.50 Драма «Іголка».

### ● РТР

7.45 Тэлесэрыял «Галоўныя ролі».
8.40 Прэм'ера. Тэлесэрыял «Пані Перамога».
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
17.50 «Аншляг».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
19.55 Клюб «Тэатар + ТБ».
21.55 Прэм'ера. Маст. фільм «Крымінальныя сувязі» (ЗША). 2001 г.

### ● Культура

15.10 Наталі. Тры жыцьці Натальлі Ганчаровай.
16.05 «Са столі».
16.35 «Я Вас кахаю», «Медная бабуля». Дак. фільмы.
17.30 Навіны культуры.
17.50 100 гадоў з дня нараджэньня Арама Хачатурана. Гала-канцэрт Акадэмічнага вялікага сымфанічнага аркестру імя П.Чайкоўскага.
18.45 Да 300-годзьдзя Санкт-Пецярбургу. «Час сабору». Дак. сэрыял. Фільм 10-ы. «Феадораўскі Гасудараў сабор».
19.10 Ток-шоў «Аркестравая яма»..
19.50 «Паненка-сялянка». Маст. фільм.
21.40 100 гадоў з дня нараджэньня кампазытара. «Стагодзьдзе Арама Хачатурана».
22.20 Блеф-клюб.
23.00 Навіны культуры.
23.25 «Хто там...».

### ● НТВ

9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Злачынства ў стылі «Мадэрн». Забойства дзеля пярсьцёнка».
10.10 «Без рэцэпту».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога».
17.25 «Нацыянальная бясьпека. Кіна ня будзе?».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Залатая калекцыя. Баявік «Законьнік».
22.00 «Усё адразу!».
22.40 «Жывы Пушкін». Праграма Л.Парфёнава. Частка пятая, заключная.

### ● Эўраспорт

9.30 Горны вэлясыпэд.
10.00 Футбол. Кубак Лібэртадорэс. Паўфінал. Першы матч. Паўтор.
11.30, 21.00 Футбол. Эўра-2004. Таварыскі матч. Паўтор.
12.30 Ралі Акрапаліс. Паўтор.
13.00 Тэніс. Легенды Ралян Гаросу. Куэртэн—Расэл.
14.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Паўфінал. Мужчыны. Жывая трансьляцыя.
22.00 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Паўфінал. Мужчыны.
23.15 «Формула». Часопіс.
23.30 Гонкі «Легенды 24 гадзін Ле Ману».
0.30 Гонкі. Мані-Кур.
1.00 Ралі-рэйд.
1.15 Ралі Акрапаліс.
1.45 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.

## 7 чэрвеня субота

### ● БТ

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 «Не зявай!». Тэлеканал для дзяцей.
8.15 Існасьць. Духоўная праграма.
8.50 «Усё нармальна, мама!».
9.30 Экран індыйскага кіно. «Сонечная дынастыя». 1-я сэрыя.
11.05 Здароўе. Тэлечасопіс.
11.35 Тэлевізійны Дом кіно. «Да 30-годзьдзя беларускай анімацыі». 1-я частка.
12.15 Вясёлая сямейка.
12.45 Падарожжа дылетанта. «Нароўля. Духоўная спадчына палешукоў».
13.00 Сола для дэбютанта. Кацярына Сумарава (мастачка).
13.10 Плянэта АРТ.
13.35 «Ёсьць толькі міг...».
14.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства».
15.15 «Знайсьці самога сябе». Відэафільм АТН.
15.35 Казка Л.Керала «Аліса ў краіне цудаў» (ЗША—Вялікабрытанія). 1-я і 2-я сэрыі.
17.05 Сусьветная калекцыя кароткамэтражных фільмаў. «Лёгкі ўдар». (ЗША).
17.20 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
17.50 Мэлядрама «Джэфэрсан у Парыжы». (ЗША).
20.10 Панарама. Інфармацыйны канал.
20.55 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Адборачны матч. Беларусь—Галяндыя. Жывая трансьляцыя.
23.05 Трэці тайм.
23.20 Начны музычны этэр.

### ● СТВ

7.30, 15.50 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00, 16.15 «Сьвет Бобі». Мультсэрыял.
8.25 «СТВ-спорт».
8.35 «Рэактыўны бокс».
8.50 «Сьвецкая хроніка».
9.05 «Плянэта людзей».
9.20 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
9.45 «Кіно — дзецям»: казка «Пра Чырвоную Шапачку», 1-я сэрыя.
10.50 «Разам».
11.20 «Рамонт».
11.35, 20.10 Тэлесэрыял: «Месца сустрэчы зьмяніць нельга».
13.05 Кіно: прыгодніцкі фільм «Бармэн з «Залатога якара».
14.45 «Дружная сямейка». Сэрыял.
16.40 «Усё для цябе».
17.10 Кіно: камэдыя «Афрыканец». Францыя, 1982.
19.30 «24 гадзіны».
19.50 «СТВ-спорт».
21.50 Кіно: трылер «Прыватны дэтэктыў». Францыя, 1976.
23.35 «Навіны СНД».
23.50 Кіно: драма «Сука-любоў». Мэксыка, 2000.

### ● Першы музычны канал

8.00, 12.30 Рухач.
12.00 «Сіла цягі».
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

### ● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Грай, гармонік любы!
9.00 Слова пастыра.
9.15 Здароўе.
10.00, 14.00 Навіны (з субтырамі).
10.10 «Смак».
10.30 Крэмль-9. «Сьвятлана Сталіна. Уцёкі зь сям'і». Фільм 3-і.
11.10 Прэм'ера. «Праваднік».
11.40 Сьмехапанарама.
12.20 «Падарожжы натураліста».
12.50 «Срэбраны шар». Аляксандар Блок.
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.10 «Расейская рулетка».
15.05 Дак. дэтэктыў. «Хроніка аднаго забойства».
15.35 «Андрэй Вазьнясенскі-2003».
16.55 Дэтэктыў «Забіць прытворшчыка».
18.25 Песьня году. Лета.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
21.05 Футбол. Адборачны матч.Чэмпіянат Эўропы-2004. Зборная Швайцарыі — Зборная Расеі. Жывы этэр са Швайцарыі.
23.05 Што? Дзе? Калі? Фінал летніх гульняў.
0.30 Камэдыйны трылер «Забойства на радыё» (ЗША).

### ● РТР

8.45 «Ранішняя пошта».
9.20 «Сто да аднаго». Тэлегульня.
10.15 «Сам сабе рэжысэр».
11.15 «У пошуках прыгод».
12.10 «Клюб сэнатараў».
13.00 Весткі.
13.20 Камэдыя «Запасны гулец». 1954 г.
15.00 Прэм'ера. Камэдыя «Ідэальны муж» (ЗША). 1999 г.
17.00 «Мая сям'я».
18.00 «Аншляг».
19.00 Весткі.
19.25 «Люстра».
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.15 Сусьветнае кіно. Прэм'ера. Мэл Гібсан у ваеннай драме «Мы былі салдатамі» (ЗША). 2002 г.
23.00 Прыгодніцкі фільм «Прыбыцьцё» (ЗША). 1996 г.

### ● Культура

10.50 Пецярбург-300. «Пра казу...». Дак. фільм.
11.05 ГЭГ.
11.20 «Графаман».
11.45 Дзіцячы сэанс. «На залатым ганку сядзелі...». Маст. фільм.
12.50 «Муха-цакатуха». Мультфільм.
13.00 «Дар дажджоў. Вялікія рэкі Афрыкі». Фільм 11-ы. «Аліфантэ. Рака скарбаў».
13.30 «Мэгрэ вагаецца». Тэлеспэктакль.
16.25 Магія кіно.
16.50 «Рамантыка рамансу».
17.30 «Гігант». Маст. фільм.
19.10 «Сфэры».
19.50 70 гадоў Аркадзю Арканаву. «Мой гадзіньнік сьпяшаецца...».
20.30 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Беражы мяне, мой талісман». Маст. фільм.
22.30 «Фрак народу». Пра тэатар і ня толькі.
23.20 «Перавал». Мультфільм для дарослых.

### ● НТВ

9.05 «Кулінарны паядынак».
9.55 «Кватэрнае пытаньне».
10.50 Спорт. «Лято 6 з 49».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня».
11.15 «Удовы». Прафэсія — рэпарцёр.
11.40 «Служба выратаваньня».
12.10 Камэдыя «Нечакана-неспадзявана».
13.55 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
15.55 Баявік «Нікіта».
18.05 «Зусім сакрэтна. Апошняя таямніца канкорда».
18.50 Сэрыял у выхадныя. Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі. Сьвятло праўды».
20.00 «Асабісты ўнёсак».
21.00 Дэтэктыў «Басэйн».
23.30 Супэрбокс. Арсэліна Фрэйта супраць Джаэля Касамаёра.

### ● Эўраспорт

9.30, 15.00, 2.30 Ралі Акрапаліс.
10.00 Футбол. Кубак Лібэртадорэс. Паўфінал. Першы матч. Паўтор.
11.30, 12.15, 13.00, 18.14 Футбол. Эўра-2004. Паўтор.
13.45 Мота Гран-пры. Італія. Жывая трансьляцыя.
15.30 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Фінал. Жанчыны. Жывая трансьляцыя.
20.00 Сьпідвэй. Гран-пры. Швэцыя.
21.30 Экстрэмальныя віды спорту.
22.00 Кік-боксынг. Жывая трансьляцыя.
0.15 Ралі рэйд.
0.30 Футбол. Эўра-2004. Адборачныя матчы. Спэцыяльны агляд.

## 8 чэрвеня нядзеля

### ● БТ

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.30 Арсэнал.
9.00 Альхімія слова.
9.05 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.35 Экран індыйскага кіно. «Сонечная дынастыя». 2-я сэрыя.
11.15 Сад мары.
11.40 Музэюм. «Урэцка-Налібоцкае шкло».
12.15 «Усё нармальна, мама!».
13.00 «Ваша лято».
13.40 Сьвятыні Беларусі. Старадаўнія манастыры Турава.
14.10 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства».
15.15 «Лёс чалавека».
15.40 «Барацьба за выжываньне».
16.35 «Аліса ў краіне цудаў». Маст. фільм. Заключная сэрыя.
17.20 Кліп-абойма.
18.00 Кінараман «Рока і яго браты» (Італія—Францыя). 1-я і 2-я сэрыі.
21.00 Панарама: падзеі тыдня.
21.50 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.10 Бокс. Баі наймацнейшых прафэсіяналаў сьвету. Эрык Маралез—Бобі Вэлардэз. Трансьляцыя з ЗША.
23.05 Трагікамэдыя «Добры чалавек у Афрыцы».

### ● СТВ

7.30, 15.50 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00, 16.20 «Сьвет Бобі». Мультсэрыял. Заключная сэрыя.
8.25 «СТВ-спорт».
8.40 «Філярманічны тыдзень».
8.45 «Менск і менчукі».
8.50 «Партрэт у інтэр'еры».
9.05 «Добры дзень, доктар!».
9.20 «Аўтапанарама».
9.45 «Кіно — дзецям»: казка «Пра Чырвоную Шапачку», 2-я сэрыя.
10.55 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
11.20 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.35, 20.40 Кіно: тэлесэрыял «Варыянт «Амэга».
13.05 Кіно: прыгодніцкі фільм «Ня стаўце Лесуну капканаў...».
14.45 «Дружная сямейка». Сэрыял.
16.45 «Залатая дзясятка Беларускай опэры».
17.15 «Мэтафізыка Пецярбургу».
18.15 «168 гадзін».
19.00 «Запрашаем паскардзіцца».
19.15 «Аўтапанарама».
19.35 «Пакуль гарыць сьвечка...».
20.05 «Асабісты інтэрас».
22.00 «24 гадзіны».
22.15 «Гульнявы рэфлекс».
22.25 Кіно: камэдыя «Мае пяць жонак». ЗША, 2000.
0.05 «Навіны СНД».
0.25 «Робі Ўільямз у Альбэрт-Холе».

### ● Першы музычны канал

8.00, 13.45 Рухач.
12.00 «Чарнасьліў». Культуралягічнае шоў.
13.00 «Пра Fashion». Модная праграма.
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

### ● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 «Ералаш».
8.30 Служу Айчыне!
8.55 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Юкі адкрывае Дыснэйлэнд».
10.15 «Падарожныя нататкі».
10.35 Пакуль усе дома.
11.15 Дог-шоў.
12.00 Тайны забытых перамог. «Яго ракетная вялікасьць».
12.25 «Клюб падарожнікаў».
13.05 Разумніцы і разумнікі.
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.10 «Валадар смаку».
15.10 Ток-шоў «Выбар».
15.55 Камэдыя «Кітайскі сэрвіз».
17.45 Жывая прырода. «Прагулкі з дыназаўрамі», «Страўс-маратонец».
18.50 Баявік «Гарачыя галовы». ЗША, 1991 г.
20.30 Контуры.
21.10 «Беларусы ў Афрыцы. Ралі па Сахары». Частка 4-я, заключная.
21.35 Прэм'ера. Баявік «Пад'ём з глыбіні».
23.35 Часы.
0.35 Рэальная музыка.

### ● РТР

9.15 «Ранішняя размова зь Дзьмітрыем Кісялёвым».
9.45 «У «Гарадку». Справаздача за травень».
10.20 Парад камэдый. «Боінг-Боінг» (ЗША). 1965 г.
12.10 «Парлямэнцкая гадзіна».
13.00 Весткі.
13.20 «Вакол сьвету».
14.15 «Дыялёгі пра жывёл».
15.20 «Сьвет на мяжы».
15.55 «Пакой сьмеху».
16.50 Камэдыя «Клюб першых жонак» (ЗША). 1996 г.
19.00 Весткі тыдня.
20.10 «Спэцыяльны карэспандэнт».
20.35 Сусьветнае кіно. Авантурны фільм «Пастка» (ЗША). 1999 г.

### ● Культура

11.00 Пецярбург-300. «Воднае жыцьцё». Дак. фільм.
11.15 «Рыцары сьмеху». Галівудзкія насьмешнікі.
11.40 Нядоўгія гісторыі.
11.55 Прагулкі па Брадвэі.
12.20 «Тайна Трэцяй плянэты». Мультфільм.
13.10 «Дар дажджоў. Вялікія рэкі Афрыкі». Фільм 12-ы. «Пангола. Шчодрая рака».
13.40 «Час музыкі». Тэлечасопіс.
14.10 «У сьвеце танцу». А.Хачатуран. «Спартак». Фільм-балет.
16.20 «Гісторыі з прывідамі». Мультфільм.
17.10 «Глядзіце на захад». Дак. фільм.
17.45 «Гігант». Маст. фільм (ЗША, 1956).
19.20 «Дом актора». «Цуд па імені Шлез!»
20.00 Сьмеханастальгія.
20.30 «Болей чым каханьне».
21.10 «Замкі жахаў». Дак. сэрыял. Фільм 13-ы. «Вязьні».
21.35 «Культ кіно». «Каханьне юнай Нак». Маст. фільм (Тайланд, 1999).
23.25 Джэм-5.

### ● НТВ

9.10 Сэрыял у нядзелі. «Каханьне ўдаўца», 10-я сэрыя.
10.05 «Вы будзеце сьмяяцца!».
10.15 «Расьліннае жыцьцё».
10.50 Гуляем у «Кено».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня».
11.15 «Уплыў».
12.05 Дэтэктыў «Круг».
13.55 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Экстрэмальны кантакт. Лімонная акула».
15.50 Ток-шоў «Прынцып даміно».
17.10 Камэдыя «Хто такі Гары Крамб?».
18.50 Сэрыял у выхадныя. Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі. Скрыпка Страдывары».
20.00 «Надоечы» зь Ленаідам Парфёнавым.
21.30 Стужка тыдня. Прэм'ера. Маст. фільм «Штонядзелі» (ЗША).
0.30 Сэрыял «Клан Сапрана».

### ● Эўраспорт

9.30, 1.30 Ралі Акрапаліс.
10.00, 19.00 Футбол. Эўра-2004. Адборачныя матчы.
11.00 Мота Гран-пры. Італія. Жывая трансьляцыя.
16.15 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Ралян Гарос. Фінал. Мужчыны. Жывая трансьляцыя.
23.00 Аўтагонкі сэрыі Наскар. Дуўр.
0.15 Ралі рэйд.
0.30 Матакрос. Чэмпіянат сьвету. Баўгарыя.

# Ордэн Белай мышы



9 чэрвеня, у панядзелак, Уладзімер Арлоў запрашае на прэзэнтацыю сваёй кнігі «Ордэн Белай мышы». Сваімі сьпевамі калегу падтрымае Зьміцер Бартосік. Адбудзецца імпрэза ў менскай сядзібе ТБМ (вул.Румянцава, 13), пачатак у 18.30. Хто ня зможа прыйсьці 9-га, няхай завітае 12 чэрвеня а 19-й у «Беларускую хатку» (вул.Рабкораўская, 19; ст.м. «Інстытут культуры»). Арлоў і Бартосік чакаюць! Уваход вольны.

ВОДГУКІ

# Беларусе, зьмяніся сам

**«Беларусь зьменіць Эўропу». Як патасна і эмацыйна гучаць гэтыя словы, як лашчаць слых, як цешаць яны наша «эга».** Мы мусім сыграць ролю мэсіі, зьмяніць амаральнае эўрапейскае грамадзтва, прышчапіць яму хрысьціянскія арыенціры-каштоўнасьці з дапамогай Амэрыкі. Чаму мы? Бо Беларусь — незвычайная краіна, мы не такія, як усе астатнія народы. Наш унёсак у развіцьцё ЗША, Польшчы, Расеі, краінаў Эўропы калясальны. Нашу гісторыю і геаграфію нельга параўнаць ні з адной у сьвеце. Беларусь — унівэрсальны сьвет, яна адзіная захавала Свабоду. Можна працягваць далей: у нас найлепшыя ў сьвеце лясы, тэлевізары, хакейная каманда...

Не, гэта не ўтапічна-патрыятычная «Беларусь праз 100 гадоў». Гэта Павал Севярынец выступіў на старонках «НН» (ад 6 сьнежня 2002 г.) прыкладна з такім артыкулам.

Ня ўмеем мы яшчэ думаць абшарамі сваёй маленькай сінявокай, а ўсё летуценім пра выратавальную місію, якую мусіць выканаць наша краіна для эўрапейцаў. А ці патрэбна тая місія Эўропе? Яна ўжываецца і безь яе, вой як няблага.

Мы нічым не адрозьніваемся ад іншых эўрапейскіх краінаў, у тым сэнсе, што маем свае непараўнальныя рыскі мэнталітэту. Свае рыскі маюць і эстонцы, і румыны, і ірляндцы etc. Нашая гісторыя таксама не найбагейшая. І я ня кідаўся б такімі фразамі, што акурат Беларусь ператварыла дэспатычную Расею ў Расею высокай культуры, а ганарлівую Польшчу — у рамантычную Рэч Паспалітую.

Я не хачу жыць пад дэвізам «Я мушу жыць, бо ведаю, дзеля чаго выжываю». Выжываньне — не жыцьцё. Незалежнасьць — не пляцдарм для нечага большага, а найвялікшая каштоўнасьць народу. Фокус Беларусі будзе заключацца ў тым, каб за найменшы час дагнаць у развіцьці хоць бы тую Партугалію. Беларусы ня мусяць зьмяняць Эўропу, яны павінны зьмяніць сваю краіну.

**Адась Галубовіч, Барысаў**

* * *

У «НН» №18 быў надрукаваны артыкул Сяргея Астраўца — «...дарагія таварышы»! Імя Госпада немагчыма пісаць побач з гэтым **пасквілем** на веру, людзей, на нашу Беларусь. Калі гэты таварыш ніколі ня быў у беларускай праваслаўнай царкве й падабаецца яму толькі Раство Хрыстова пад белым сьнегам, то, можа, ён бачыў бабулек у царкве дзесьці ў Сібіры? Няхай даедзе да нас, на наша Беларускае Палесьсе, зойдзе ў царкву і пабачыць, колькі людзей у Храмах, і не з батонамі, як ён напісаў.

А ў Крыжаўзьвіжанскім касьцёле ў Берасьці імша і казань гучаць на добрай польска-расейскай трасянцы, і ніхто ня піша аб гэтым у такім тоне ў «НН».

**Павал Воўк, Берасьце**

# Канец інтэлігенцыі? Даўно пара!

**Некалі *«Свободные новости»* распачалі гаворку пра лёс і ролю беларускай інтэлігенцыі. Але «СН» згарнулі выхад, і дыскусія не пасьпела разгарнуцца. А тэма вартая працягу. Пагатоў што ўвагу да тэмы прыцягнула правядзеньне Сходу інтэлігенцыі і стварэньне Рады інтэлігенцыі.**

Калі я чую слова «інтэлігент», дык уяўляю чалавека ў пэнснэ, які з захапленьнем разважае пра сусьветную палітыку, навуковы прагрэс і сьветлую будучыню свайго беднага народу, аднак робіцца млявым у пытаньнях барацьбы «за месца пад сонцам». Гэты чалавек, як і ўся інтэлігенцыя, народжаная XIX ст., на беларускай глебе захаваўся да сёньня.

Савецкая інтэлігенцыя недалёка пайшла ад сваёй дарэвалюцыйнай папярэдніцы і, хоць зьмяніла пэнснэ на акуляры, яшчэ менш стала ўплываць на рэальную палітыку. У якасьці кампэнсацыі яна захапіла духоўную сфэру, дзе (пры адсутнасьці канкурэнцыі з боку рэлігіі) пачувалася і «народным сумленьнем», і «маральным павадыром». «Беларуская інтэлігенцыя» павінна нарэшце... памерці, каб грамадзтва магло рушыць наперад.

Інтэлігент, як чалавек, што спалучае адукаванасьць, «гарадзкую культуру» і занятак разумовай дзейнасьцю, меў дакладна вызначанае месца ў малапісьменнай сялянскай краіне. Але цяпер, калі ў Эўропе сельскае насельніцтва складае 4—5%, яго культура і ўмовы жыцьця лепшыя за гарадзкія, а палова народу ўвогуле ціскае пімпачкі кампутараў (разумовая гэта праца або фізычная?), традыцыйныя размовы пра інтэлігенцыю губляюць сэнс, бо ёсьць адукаваныя фэрмэры і малапісьменныя гандляры, эрудыціяваныя прастальткі і кіроўцы, неінтэлігентныя палітыкі ды міліцыянты, малакультурныя чыноўнікі ды прагрмістыя і г.д. Інтэлігенцыя ў савецкім разуменьні зьнікае, і ёй на зьмену мусіць прыйсьці эліта — бізнэсовая, палітычная, мас-мэдыйная, інтэлектуальная, якой так не хапае нам сёньня. Адносіны яе з грамадзтвам будуць мэркантыльнымі: яна пастаўляе на «сацыяльны рынак» прадукцыю — ідэі, праекты, канцэпцыі, якія аб «купляюцца» і рэалізуюцца, або — не. Эфэктыўная дзейнасьць эліты выгадная ўсім, бо яна штурхае грамадзтва наперад і спрыяе яго ўзбагачэньню. А бальшавіцкія парадкі, што пануюць у Беларусі сёньня, — галоўны тормаз.

Інтэлігенцыя дэградавала ня менш за іншыя сацыяльныя групы. Адукаванасьць даўно перастала быць сынонімам высокай, тым больш духоўнай культуры. Яшчэ за савецкім часам адукаваны хам стаўся распаўсюджанай зьявай. Тавую роля інтэлігенцыі ў будучым зробіцца больш прыкладной і вузкаспэцыялізаванай. Хоць ня выключана, што асобныя лідэры інтэлектуальнай ці палітычнай эліты будуць мець вялікі маральны ўплыў на сучаснікаў. У такой далікатна-крохкай сфэры, як духоўнасьць, усё вырашае ня проста інфармаванасьць ці адукацыя, а вялікая цярплівасьць у пошуку жыцьцёвай ісьціны, перакананасьць у сваім прызначэньні, уласны прыклад цьвёрдасьці ды мэтанакіраванай волі, насуперак хістаньням моды і сацыяльнай каньюнктуры. Таму гэтая сфэра адкрытая для левых і правых, «ніжніх» і «верхніх», інтэлігентаў і неінтэлігентаў, але «адкрытая» ня значыць «лёгка даступная». Ступіць у яе пасапраўднаму дадзена нямногім.

**Васіль Аўраменка, Магілёў**

# Травеньскі «Беларус»



**Травеньскі нумар газэты беларускай дыяспары за акіянам «Беларус», што выходзіць у Нью-Ёрку, зьмяшчае матэрыялы, прысьвечаныя памерлай Зоры Кіпель, друкуе яе ўспаміны пра Натальлю Арсеньневу.** У традыцыйных рубрыках газэты — пра жыцьцё асяродкаў у замежжы: сьвяткаваньне Дня Волі ў Канадзе, 20-годзьдзе беларускага радыё ў Заходняй Аўстраліі, канфэрэнцыя «Аднаўленьне беларускай дэмакратыі» ў амэрыканскім Полацку, допісы беларускіх эмігрантаў з ацэнкамі апошніх падзей жыцьця ў сьвеце й на бацькаўшчыне. Сканчаецца ж нумар цікавым паведамленьнем, што Вольга Качан у памяць свайго мужа Аркадзя ахвяравала БІНіМу на выданьне беларускіх кніжак 15 тыс. даляраў. Дзякуючы гэтаму пабачыць сьвет беларуска-ангельскі слоўнік (60 тыс. лексычных адзінак і 1000 старонак тэксту), які рыхтуецца да друку.

# Досыць кнігі

Шаноўныя гаспадары і гаспадыні «Нашай Нівы»! Я думаю, што конкурс для падпісчыкаў трэба праводзіць сымбалічна. Ня трэба дарагія прызы, добра атрымаць ад вас добрую кнігу. Газэту вашу выпісваю вельмі даўно. Мне больш за 70 гадоў. Калі падрастуць унукі, унучкі, то яны будуць выпісваць вашу газэту: такі будзе наказ мой.

**Анастас Семяновіч, Бараўляны**

**Ад Рэдакцыі:** Разглядайце прызы як прыемныя неспадзяванкі. Іх прэзэнтуе не Рэдакцыя, а некалькі чытачоў «НН», якія маюць такую магчымасьць.

# Cui bono?

**У канцы траўня хтосьці апаганіў помнік габрэям — ахвярам генацыду на «Яме» ў цэнтры Менску, намаляваўшы тамака свастыкі ды пакінуўшы абразьлівыя надпісы. Каму выгадна?**

Афіцыйныя СМІ адразу ж усчалі шум, сэнс якога зводзіцца да адной простай рэчы: цяперашні рэжым здольны абараніць сваіх грамадзянаў — «ну хай сабе і габрэяў» — ад пагрозы «справа», нэанацыстаў і г.д. Замежнікам мусіла спадабацца такая імгненная рэакцыя, дый грамадзянам Беларусі трэ было нагадаць, дзе шукаць абароны. Чым, як не запалохваньнем люду паспалітага, вытлумачыць зьяўленьне ў «Советской Белоруссии» здымку помніка аж з трыма свастыкамі? Пра такую рэкляму вандалы, калі яны сапраўды належаць да маргінальных груповак (на што намякае «СБ»), маглі толькі марыць.

Усчаты шум — пасланьне ня толькі да замежнікаў (вось, маўляў, як мы пра нашых габрэяў клапоцімся), але й да самых беларускіх габрэяў. Апошнім часам заўважныя прыкметы паступовага іх ператварэньня зь «пешак у чужой гульні» ў сапраўдную грамаду, здольную адстойваць свае інтарэсы. Прынамсі, у красавіку лідэры габрэйскіх суполак падпісалі даволі жорсткі супольны ліст у прэзыдэнтуру і ўрад, чаго немагчыма было дабіцца яшчэ год-два таму. Пасьля гэтага ліста з шапікаў Белсаюздруку зьнікла антысэміцкае выданьне — маскоўскі «Русский вестник». На сёлетнім зьезьдзе Саюзу беларускіх габрэйскіх грамадзкіх аб'яднаньняў і грамадаў станоўчыя зьмены ў сьвядомасьці габрэяў мусяць прывесьці да зьменаў у кіраўніцтве найбуйнейшай габрэйскай суполкі краіны. Ці ня ёсьць дэманстратыўны акт вандалізму сыгналам: «Сядзіце ціха, абірайце каго вам скажуць»?

Летась, адказваючы на мой ліст, намесьнік адміністрацыі Цэнтральнага раёну сталіцы Д.Навіцкі дэкляраваў: «УУС Цэнтральнага раёну г.Менску прыняты захады па ўзмацненьні кантролю за захаванасьцю мэмарыяльнага комплексу». Каб гэтыя захады насамрэч былі зроблены, старым не даводзілася б глытаць валідол, а ўрадоўцам думаць, як зрабіць добрую міну пры кепскай гульні.

**Вольф Рубінчык, Менск**

# У пошуках беларускай граматыкі

**Пішучы сьцісла даведнічак па граматыцы беларускай мовы для самаробнага беларуска-італьянскага слоўнічка, я мушу карыстацца звычайнымі школьнымі падручнікамі ды фаліянтам «Беларуская мова» БелСЭ (даволі эклектычная і дзіўная кніга).**

У гэтых пошуках мне патрапіла ў рукі вельмі добрая, і цікавая, і карысная, і патрыятычная кніжка «Беларуская мова» спадарыні Лідзіі Сямешкі (1999). Дзякую ёй. То, можа, гэтая добрая спадарыня і ўзяла б на сябе нудную і важкую працу з радаснай пэрспэктывай напісаць хоць бы на 300 старонак (з гістарычнымі экскурсамі) граматыку нашай мовы. Сыстэматызаваную (бязь дзіўных формаў дзеепрыметнікаў цяперашняга часу, як у «БМ» БелСЭ).

Як я зайздрошчу гішпанцам! Яны хваляцца, што выпусьцілі мо 26-е выданьне слоўніка сваёй мовы (адначасна й на кампакт-дыску, у электроннай вэрсіі) і што тамака ўсё можна знайсьці, і каштуе ён ўсяго 46 эўра. Што да 100-годзьдзя з народзін Мігеля Эрнандэса — паэта — яны арганізавалі 24-гадзіннае чытаньне ягоных вершаў у Інтэрнэце. (У грамадзянскую вайну ў іх загінула ўсяго мо два паэты — Лорка і Эрнандэс. А ў нас?!! Клычаць Курапаты — і ўсё!)

Нам трэба БЕЛАРУСКАЯ ГРАМАТЫКА.

Сёлета ў Беларусь прыедуць баскія нацыяналістыя. Што мы ім дамо пачытаць без граматыкі і слоўнікаў?

**NIC, Сьветлагорскі раён**

ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ

# Лёс скідзельскай бібліятэкі

**Скідзельская вэтэранская арганізацыя ў свой час стварыла фотаальбом «Памяць».** Сярод здымкаў ёсьць і фота, якому сёлета споўнілася 78 гадоў. На ім — сябры гуртка Таварыства беларускай школы ля дому, які й сёньня стаіць пад №19 на вуліцы 17 верасьня. З тых 25 сяброў гуртка да сёньня застаўся ніхто не дажыў. А вось людзі, якія іх помняць, — ёсьць. У Горадні ў дачкі Валянціны бавіць сваю старасьць 93-гадовая Надзея Кліменка. Фармальна сябрам гуртка яна не зьяўлялася, але брала ў ім самы актыўны ўдзел.

«У 25-м мне стукнула 15 гадоў, — расказвае баба Надзея. — Тады ў Скідзелі пачаў дзейнічаць гурток ТБШ, стваральнікам якога быў мой старэйшы брат Пятро. Сабраў рознаю літаратуру для бібліятэкі, якую разьмясьцілі ў хаце маіх бацькоў. Наша сям'я была вялікая — васьмёра дзяцей (чатыры дачкі і чатыры сыны), хата была з аднаго пакою, але месца хапала. Сярод кніжак былі творы Якуба Коласа, В.Дуніна-Марцінкевіча, Янкі Купалы, М.Багдановіча, Э.Ажэшкі, А.Міцкевіча, Г.Сянкевіча ды іншых пісьменьнікаў. І, вядома, выпісвалі газэты й часапісы, якія выдаваліся ў Вільні. Грошы на іх зьбіралі па людзях». Дагэтуль у аўтара гэтых радкоў захаваліся кнігі са штампам ТБШ, беларускі каляндар на 1931 год...

«Ня раз, — працягвае Надзея Кліменка, — паліцыя штосьці шукала ў кніжным фондзе. Асабліва цікавасьць праяўлялі да сатырычнага часопісу «Маланка». Сябры гуртка давалі спэктаклі й канцэрты. Памятаю, пасьля канцэрту ў вёсцы Баброўня, што за 10 км ад Скідзелю, на сцэну выйшаў нейкі вясковец і стаў чытаць свае вершы. Пасьля мы даведаліся, што гэта быў знакаміты паэт Міхась Васілёк (Міхаіл Касьцевіч). На Новы год для дзяцей зь бедных сем'яў ТБШ ладзіла елку, дзяцей частавалі цукеркамі».

Пасьля нечаканай сьмерці Пятра Сеўрука бібліятэка пераехала ў хату Пятра Бурца, на хутар ля вёскі Галавачы. За саветамі фонд гуртка ТБШ перайшоў да Скідзельскай раённай бібліятэкі, а пасьля скасаваньня раёну ў 1962 г. — да гарадзкой бібліятэкі №1. Туліцца кніжны фонд у драўляным будынку, які дастаўся ад рэпрэсаваных і адпраўленых у Сібір людзей. Многія дзесяцігодзьдзі наш цяпер Гарадзенскі раён хадзіў у перадавых, а пабудаваць новую бібліятэку рукі так і не дайшлі.

**Ільля Барысаў, Скідзель**

• ДЫСКАГРАФІЯ •

## Enjoy the silence

«Крама», MSH Rec., 2003




На гэтай плытцы «Крама» прэзэнтуе сваю вэрсію адной з самых вядомых песень «Depeche Mode». Астатнія трэкі — танцавальныя апрацоўкі гэтай самай песьні ў розных стылях (хаўз-мікс, рок-мікс, поп-мікс), зробленыя менскімі ды-джэямі.

Сынгл выдадзены насуперак усім законам шоў-бізнэсу. Звычайна такія рэлізы выходзяць у падтрымку асноўнай праграмы, таму «Enjoy the silence» мусіў зьявіцца напярэдадні выхаду «Personal Depeche». Дый «Крама» не плянавала выдаваць асобны дыск — музыкі папросту не пасьпелі запісаць песьню ў тэрмін. Але «Enjoy the silence» у якасным выкананьні «Крамы» не згубілася б і на «Personal Depeche». Пачуць новую працу «крамароў» зможа невялікая аўдыторыя: дыскаў усяго тысяча, і атрымаць адзін зь іх можна, толькі набыўшы які ровар у супэрмаркеце «Спартмайстар».

Паводле словаў генпрадусара праекту Руслана Макарава, «Personal Depeche» стаўся самай прадавальнай кампіляцыяй беларускай музыкі па выніках 2002 г. Дыск можа стацца штуршком да «беларускай экспансіі» ў Расею (як некалі была ўкраінская, ачоленая Алегам Скрыпкам). Песьня «Бяз гучных словаў» («Крыві») тры тыдні трымалася ў гіт-парадзе маскоўскай FM-станцыі «Наша радыё». Прадусары мяркуюць, што «крамаўскі» кавэр таксама можа ўзьляцець на самыя высокія прыступкі беларускіх і замежных гіт-парадаў. Цяпер ідэолягі «беларускіх дэпэшаў» рыхтуюць да выданьня яшчэ адзін трыб'ют. Гэтым разам будзе «прысьвячэньне» «The Doors», у якім, апроч нашых «Беларускіх песьняроў» ды «Рунаў», возьмуць удзел «ВВ» і «Океан Ельзи» з Украіны, а таксама расейскія гурты, сярод якіх «Сплин» і «Би-2».

## Звуковое оружие

«Куклы», O'leg & Куклы, 2003

Музыка, якую б загадчыца Ёцавіцкага ДК назвала «роў дзікі». Гардкор — музыка новага пакаленьня, і «Куклы» маюць усе шанцы стаць лідэрамі гэтага пакаленьня. «Гукавой зброяй» можна назваць ня толькі гэты дэбютны альбом, але і акрэсьліць дадзены кірунак. Такога кшталту музыка — рэакцыя на праявы сучаснага жыцьця: «як бачым, так і трызьнім», пяюць «Куклы». Музыкі не імкнуцца дыстанцыявацца ад сваіх слухачоў, узвысіцца. Іхны імідж — «свае ў дошку хлопцы», для якіх жыцьцё — гэта вайна. Яны сьвядома скіроўваюцца ў непадкантрольнасьць, адасабляюцца ад нормаў і правілаў: «разбурай усё, што табе замінае», — так гучыць лёзунг, напісаны на вокладцы. Вакаліст зрывае голас на рэфрэне «Я люблю сваю краіну», але беларускамоўная песьня ў альбоме толькі адна.

**Сяргей Будкін**




# Сутыкненьне прэм'ераў

**Усё выглядала, як у той колішняй трагедыі ў бухце Новарасійску. Капітаны «Адмірала Нахімава» і «Пятра Васева» трымаліся абранага курсу, хоць і бачылі, што караблі неўзабаве сутыкнуцца. Абодва да апошняе хвіліны спадзяваліся, што сустрэчны карабель зьменіць курс. У выніку сотні людзей загінулі. У нашым выпадку сутыкнуліся прэм'еры. Ніхто не загінуў, але ўражаньне сапсаванае.**

Нашы тэатры, асабліва музычныя, якія нячаста цешаць публіку навінамі, ахвотна прэзэнтуюць новыя працы пры канцы сэзону. Папярэдняя прэм'ера ў Опэры — «Багема» Пучыні ў пастаноўцы пермяка Георгія Ісаакяна — адбылася 20 чэрвеня 2002 г., яшчэ ў мінулым сэзоне. Музычны тэатар крыху больш прадукцыйны: 6 сьнежня 2002 г. ён прадставіў рок-опэру «Юнона і Авось» у пастаноўцы растоўскага рэжысэра Яўгенія Хандака. І вось новыя прэм'еры: у Опэры — «Хаваншчына» Мусаргскага ў сцэнічным прачытаньні Маргарыты Ізворскай-Елізар'евай; у Музкамэдыі — «Каралева чардашу» Імрэ Кальмана ў рэжысуры Барыса Ўторава. Адбыліся яны ў адзін дзень — 29 траўня. Нібы абодва тэатры існуюць у нейкай ізаляванай прасторы, ня дбаючы ані пра посьпех, ані пра грошы, ані пра гледачоў-заўсёднікаў.

Мне адразу згадаўся канцэрт тэнара Сяргея Драбышэўскага ў Опэры 8 траўня. Было пагодна, пяць выходных запар. Большасьць патэнцыйных слухачоў разьехаліся за горад. Між тым Драбышэўскі, саліст Марыінскага тэатру, варты ўвагі. У Менску ён выступае нячаста, а калі да яго ставіцца гэткім чынам — увогуле зьнікне з нашага небасхілу, як гэта ўжо здарылася з многімі беларускімі сьпевакамі.

Канцэртам Драбышэўскага ахвяравалі, кажуць, дзеля сцэнічных рэпэтыцыяў «Хаваншчыны». Але дзеля чаго ахвяравалі «Хаваншчынай»? Небывалы выпадак: на прэм'еры было шмат пустых крэслаў. Бо частка публікі аддала перавагу апэрэце. Там і музыка знаёмая, і буфэт цікавейшы. Туды ж накіраваліся й працаўнікі Опэры, стомленыя бясконцымі прагонамі «Хаваншчыны». Гэткім чынам, удзельнікі прэм'ернага спэктаклю апынуліся без падтрымкі «сваіх». Можна было б падумаць, што кіраўніцтва Опэры імкнулася «зарэзаць» рэжысэра. Але ж пастаноўку «Хаваншчыны» ажыцьцяўляла сама спадарыня Елізар'ева, і яна ж, напэўна, прымала рашэньне наконт дня прэм'еры.

Музычнаму тэатру недарэчны расклад прэм'ераў нашкодзіў яшчэ болей, чым Опэры. Міністэрскае начальства, кансэрваторская прафэсура і высокакваліфікаваныя аматары палічылі за лепшае паслухаць «Хаваншчыну». Да таго ж у Менску нямнога добрых аркестравых музыкаў, і многія зь іх вандруюць па «чужых» аркестрах, узмацняючы іх у выпадку патрэбы. «Хаваншчына» патрабуе вялікага аркестру; у «Каралеве чардашу» таксама дзьвюма скрыпкамі не абыдзешся. У выніку супадзеньне прэм'ераў зашкодзіла настрою і якасьці гучаньня.

**Юлія Андрэева**

# Далі блюзу

**Упершыню ў гісторыі міжнароднага фэстывалю «Noc bluesowa» конкурсную праграму выйгралі беларускія музыкі — трыё «Big Val, Svet & Al».**



BigVal (Валеры Прахожы) — прафэсійны перакладчык

Фэст гэты штогод адбываецца ў радавым гняздзе князёў Мазавецкіх — Раве Мазавецкай. Беларусы прыяжджаюць туды ўжо тры гады і ўзроўнем выкананьня не саступаюць сваім блюзавым калегам зь іншых краін. А ў прызэры раней не выходзілі, бо не маглі адшукаць адпаведны спосаб падачы для свайго блюзу.

Трыё «Big Val, Svet & Al» было адзіным сёлета калектывам, які прапанаваў каранёвы, найбольш старажытны, клясычны дэльта-блюз у акустычным варыянце, што для сяброў міжнароднага журы было як хрумсткі гурок пасьля кілішка добрага блюзавага напою. Усяго ў конкурсе бралі ўдзел па аднаму гурту зь Нямеччыны, Чэхіі, Славакіі, Францыі, Беларусі і шэсьць польскіх камандаў, адабраных з двух дзясяткаў, што дасылалі ў аргкамітэт свае дэма-запісы.

### «Афрабеларус» Прахожы

Беларусы выцягнулі добры пяты нумар і адразу ж, як зьявіліся на сцэне, пачалі спэктакль: гаманілі міжсобку на выдатнай ангельскай, расказалі караценька пра сябе, сяброў і сваякоў, пра цяжкую долю блюзмэна. У журы пачалі неўразуменна пераглядацца: маўляў, сьпяваць яны калі-небудзь будуць ці як? Гэта быў выдатны ход! Якраз тут узяла голас слайд-гітара Эла, забурчаў губны гармонік Сьвета, а Вялікі Валера (Big Val) даў чаду сваім наскрозь чорным голасам. Ураканьне было незвычайнае: адзін зь сяброў журы потым адшукаў Валеру, каб на ўласныя вочы пераканацца, што гэта, па-першае, чалавек зь белым колерам скуры, а не пераапрануты афраамэрыканец, а, па-другое, што ён і ў жыцьці мае даволі нізкі голас. Зьдзіўленьню не было межаў, асабліва калі ў журы даведаліся, што Валер Прахожы — прафэсійны перакладчык — усяго гады з тры таму ўпершыню паспрабаваў сьпяваць блюз.

Скончылі нашы свой конкурсны сэт славутым «Hoochie Coochie Man», пасьля чаго на сцэне застаўся адзін Сьвет, які ў вольны ад музычнае дзейнасьці час працуе стаматолягам у Мядзеле. Хлопец выдаў на гармоніку такое заліхвацкае сола, што заставалася толькі гадаць, якое ж месца атрымаюць беларусы. Перад нашымі грала вясёлая чэская каманда «Hoochie Coochie Band», прапанаваўшы блюз узору Чыкага 50-х гадоў. Музыкі закантачылі міжсобку адразу і, пакінуўшы журы думаць, выправіліся ў горад — пайграць на вуліцы дзеля ўласнага задавальненьня, а зароблянае выдаткаваць на піва.

Журы адпрацавала супэрдэмакратычна. Напачатку кожны зь сямі яго сяброў назваў калектывы, якія зьвярнулі на сябе ўвагу. Другі тур галасаваньня разглядаў толькі тры калектывы, якія набралі большасьць галасоў, пры гэтым кожны зь сяброў журы мусіў назваць і адпаведнае месца калектыву ў конкурсе. Найбольш балаў набралі нашы, пасьля — чэхі, а на трэцім месцы апынуліся французы «Tia and The Patient Wolves» з саліст-кай-гітарысткай Ціяй. Яшчэ адну трэцюю прэмію прысудзілі палякам з «Pachwork»; голас салісткі гурту Аляксандры Лысяк надзвычай нагадвае вакал Джэніс Джоплін.

У канцэрце ляўрэатаў беларусы і чэхі разам адыгралі чатыры кампазыцыі, выклікаўшы сапраўдныя «брава». Дый вядоўцы — блюзмэн Славэк Вэшхольскі і радыёкамэнтатар Войцех Асоўскі (нашчадак Яна Чачота, дарэчы) — шчодра сыпалі кампліменты на адрас трыё «Big Val, Svet & Al». Чэхі адразу ж запрасілі нашых да сябе на фэст «Блюз у лесе», аднак сёлета пасьпець аформіць візы было ўжо немагчыма. Паедуць налета. А вось чэскі квартэт мусіць зьявіцца ў Менску раней. Раю гэты канцэрт не прапусьціць, як і праграму на БТ: Кацярына Нявінская і Канстанцін Карніенка былі ў Раве і рыхтуюць праграму, прысьвечаную трыюмфу беларусаў на «Блюзавай ночы».

### Знойдзены Шэўчык і землякі гарадзенцы

Каго напаткалі надзвычайныя прыгоды, дык гэта менскі гурт «Плян», які выступаў на фэсьце ў гасьцявой праграме. На мяжы выявілася, што гітарыст Жора Станкевіч мае пратэрмінаваны пашпарт. Памежнікі добра разумелі сытуацыю, але нічым дапамагчы не маглі. У выніку «Плян» прыехаў на месца без гітарыста і ў неймаверным стрэсе, зьбіраючыся выступаць як трыё. І ў гэты момант з-за рога гатэлю выйшаў… Ільля Шэўчык (экс-«Крама», «Mojo blues»). З гітарай. Вяртаўся вось зь Нямеччыны і вырашыў зазірнуць у Раву. Андрэй Плясанаў рэпэтаваў зь ім у нумары гатэлю гадзіны чатыры, і выступіў «Плян» няблага. Публіцы спадабаліся і беларускамоўныя блюзы, і польскія песьні.

Гурт «Seven B» у праграме нагул ня значыўся, аднак, калі ён працаваў на сцэне, некаторыя твары падаліся мне вядомымі. Ну як жа! Гэта музыкі з даўняй гарадзенскай банды пад той самай назваю. Андрэй Макарэвіч, Генік Лоска замацярэлі, выступаюць па ўсёй Польшчы, выдаюць дыскі. На апошнім яны запісалі па-польску такую фанкавую вэрсію «Касіў Ясь канюшыну». Гавораць гарадзенцы па-беларуску, але ўжо з моцным акцэнтам. Землякі адразу ж абмяняліся кампактамі і напоямі.

Скончыўся фэст фаерверкам і надзвычай эмацыйным «мітынгам» выканаўцаў на губным гармоніку. Налета можна чакаць, што ўзровень «Nocy bluesowej» будзе куды больш высокі: гарадзкія ўлады зразумелі, якую рэкляму дае фэстываль. Але нават і такая «Блюзавая ноч» застаецца для беларускіх блюзмэнаў добрым шанцам паказацца ў годнай кампаніі, павучыцца ў майстроў і сяму-таму навучыць іншых. Блюз такі жыве ў Беларусі. А куды ён дзенецца, зрэшты?!



Svet (Сьвятаслаў Хадановіч) — стаматоляг зь Мядзелу

**Дзьмітры Падбярэскі, фота аўтара**

# Сыльва і рэжысэры

**«Каралева чардашу», на прэм’еру якой нас запрашае менскі тэатар музкамэдыі, — гэта тая ж «Сыльва». Але адначасова зусім і ня тая. Іншыя яе імёны — «Цыганская прынцэса», «Дзіця шантану», «Дзяўчына з Рыўеры».**

Першакрыніцаю ўсіх вэрсіяў быў спэктакль, пастаўлены ў 1915 г. венскім тэатрам імя Штраўса. Гэтая апэрэта ў трох актах, прысьвечаная зорцы будапэсцкага кабарэ Сыльве Варэску, звалася «Хай жыве любоў!». Лібрэта па-нямецку склалі вугорскія габрэі Лео Штэйн і Бэла Енбах — тыя, што стварылі сюжэт «Вясёлай удавы». Музыку напісаў Эмэрых Кальман — таксама вугорскі габрэй, які ў свае 33 гады ашчасьлівіў сьвет толькі парай нікому не патрэбных сымфоніяў і дзьвюма апэрэтамі.

Новы спэктакль меў казачны посьпех. За некалькі месяцаў ён заваяваў Вену, Будапэшт, Лёндан ды Парыж. Апэрэту пераназвалі ў «Княгіню чардашу» альбо «Цыганскую прынцэсу». У верасьні 1917 г. ейная слава сягнула Нью-Ёрку. Пастаноўка ў брадвэйскім тэатры «Новы Амстэрдам» прайшла 78 разоў. Лібрэта было цалкам перапісанае: амэрыканская «Сыльва» звалася «Дзяўчына з Рыўеры».

## Нацысты выкінулі Кальмана з тытраў

У Расеі для яе таксама вымысьлілі новы назоў — «Дзіця шантану». Пасьля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. апэрэта пра дзяўчыну з народу, ахвяру каставых забабонаў, была вельмі дарэчы. Тэкст пераклалі, спрасьціўшы: князя Эдвіна Валерштайна пераўтварылі ў прынца Валапюка, а ягонага бацьку — у паўдурка. Сыльву пазбавілі цыганскасьці, а заадно й тытулу «княгіні». Прэм’ера адбылася ўлетку і мела грандыёзны посьпех.

Пасьля кастрычніцкага перавароту слова «шантан» таксама стала непажаданым. І дырэктар пецярбурскага тэатру «Летні буф» Апалінары Фэана, які стварыў тое «Дзіця», мусіў ізноў спрашчаць: апэрэта стала звацца «Сыльва», тэксты арыяў складалі напаўгалодныя пецярбурскія паэты, мэлёдыі рабіліся прастымі, а дыялёгі — пляскатымі, як талерка... Так выйшаў твор, якім захапляліся некалькі пакаленьняў савецкіх людзей.

Тым часам першасная «Княгіня чардашу» была ў Эўропе на піку папулярнасьці. Упершыню яе экранізавалі ў Нямеччыне ў 1919 г. — бяз гуку, але музыка была ўва ўсіх на слыху. Першы гукавы фільм на сюжэт «Сыльвы» таксама быў створаны ў Нямеччыне ў 1927 г. Трэцяя нямецкая вэрсія 1934 г., з удзелам кіназоркі Марты Эгерт, сталася адной з самых папулярных стужак у Трэцім Райху. Фільм рэжысэра Георга Якобі так падабаўся немцам, што гітлераўцы не рызыкнулі яго зьнішчыць. Яны толькі выкінулі габрэйскае прозьвішча Кальман з тытраў.

Першую савецкую экранізацыю апэрэты ажыцьцявілі ў 1944 г. на Сьвярдлоўскай кінастудыі. Значная частка арыгінальнай музыкі кудысьці зьнікла, яе замянілі вульгарныя песенькі нейкага Ўладзімера Беліца. Імя кампазытара таксама з часам падмянілі: габрэйскае «Эмэрых» ператварылася ў вугорскае «Імрэ».

«Сыльва» з дэфармаваным бальшавікамі лібрэта спраўна «рабіла касу» ва ўсіх тэатрах музкамэдыі СССР. Сотні апэрэтачных барытонаў з фальшывым энтузіязмам пялі: «Без женщин жить нельзя на свете, нет…» Нават у фільме рэжысэра Яна Фрыда, які выйшаў на экраны ў 1981 г., князя па-ранейшаму звалі Эдвін Валапюк.

Першым насьмеліўся вярнуць героям сапраўдныя імёны Вячаслаў Цюпа, кіраўнік менскага тэатру музкамэдыі. Ягоная «Сыльва», пастаўленая ў сярэдзіне 1980-х, жыла на беларускай сцэне больш за дзесяць гадоў. Пасьля Цюпа вымушаны быў зьехаць, хоць дагэтуль упарта трымаецца беларускага грамадзянства, нават кіруючы Краснаярскім тэатрам опэры і балету. Штолета Цюпа зь сям’ёй едзе на аўтамабілі праз усю Расею і паў-Беларусі, каб убачыць бацькоў, што засталіся ў Менску.

## Цэцылія замест Сыльвы

У сярэдзіне 80-х савецкія дзеячы музычнага тэатру пачалі шукаць аўтэнтычны варыянт «Сыльвы». Здавалася б, чаго тут шукаць? «Княгіня чардашу» ніколі не зьнікала з рэпэртуару нямецкамоўных тэатраў. Не заўжды гэтыя спэктаклі вытрымваныя ў традыцыйным стылі. Дзея «Княгіні чардашу», пастаўленай Крыстофам Альбрэхтам у дрэздэнскай «Сэмпэр Опэра», адбываецца падчас першай сусьветнай вайны, Сыльва танчыць зь безгаловым жаўнерам, а па-над сцэнай лётаюць фрагмэнты чалавечых целаў. Спэктакль быў забаронены пастановаю гарадзкога суду.

Аднак расейскія рэжысэры шукалі аўтэнтычную «Сыльву» ня ў Аўстрыі ці Нямеччыне, а ў сацыялістычнай Вугоршчыне. Савецкая прапаганда заўжды настойліва падкрэсьлівала вугорскасьць Кальмана, хоць уся ягоная творчасьць была зьвязаная зь Венай і зь нямецкаю моваю. Вэрсія «Сыльвы», якую гралі ў Будапэсцкім тэатры апэрэты, моцна розьнілася ад арыгіналу. Аўтарамі яе былі Іштван Бэкефі і Дэса Келер. На пачатку 1950-х яны перапісалі старое нямецкае лібрэта з разьлікам на вугорскую пяюльню Ганну Гонці. Тая ў свой час была непараўнальнай Сыльвай, а пастарэўшы, патрабавала «сталых роляў». Таму галоўным пэрсанажам апэрэты вугорцы зрабілі ня Сыльву, а маці Эдвіна, якая стала называцца Цэцыліяй фон Валерсгейм, што гучала больш па-вугорску, чым Валерштайн. Паводле новага сюжэту, у маладыя гады Цэцылія была артысткаю кабарэ, але прамяняла славу каралевы чардашу на багацьце. Некаторыя ранейшыя арыі Сыльвы ўпрыгожылі партыю Цэцыліі. Састарэлая гераіня танчыла, жартавала і разважала больш, чым ейная маладая суперніца.

Так «Княгіня чардашу» пераўтварылася ў «Каралеву чардашу» і ў перакладах з вугорскай трапіла ў СССР. Лібрэта выявілася занадта доўгім і блытаным для постсавецкага гледача, які прывык, што ў апэрэце думаць ня трэба. У Санкт-Пецярбурскім тэатры музкамэдыі пераклад скарацілі да двух актаў, выкінуўшы ўсе дадатковыя сюжэтныя лініі. Новую сцэнічную рэдакцыю і пастаноўку «Каралевы чардашу» ажыцьцявіў у 1995 г. рэжысэр Аляксандар Бялінскі. Ролю Сыльвы выконвае колішняя беларуская прыма Сьвятлана Лугава. На пачатку 1990-х яна яскрава прэзэнтавалася ў беларускай «Сыльве».




## Салодкая другаснасьць

Пецярбурская «Каралева чардашу» глянулася менскаму тэатру музкамэдыі, калі паўстала пытаньне, чым запаўняць дзіркі ў рэпэртуары. Дый галоўная роля ў п’есе пасуе знакамітай Натальлі Гайдзе. Яна ў ролі Цэцыліі Валерсгейм пераўзышла саму сябе. Сьпявае і танчыць з такім маладым запалам, бляскам ды лёгкасьцю, што юныя прымы могуць ёй толькі пазайздросьціць. Глыбокае ўражаньне робіць эпізод, калі гераіня пасьля працяглага перапынку трапляе ў вар’етэ, дзе яна калісьці выступала. Тутака душа артысткі раскрываецца перад гледачамі ва ўсёй прыгажосьці.

Сыльву Варэску грае Людміла Станевіч. Яна здолела стварыць вобраз, адрозны ад праўніцыйных апэрэтачных штампаў; вобраз, якому спачуваеш, — глыбокі і хвалявальны. Адзінае, што ёй крыху замінае, гэта недасканаласьць вакальнай артыкуляцыі — недахоп, тыповы для нашых актораў-сьпевакоў.

Антон Заянчкоўскі — вельмі абаяльны Эдвін з прыгожым голасам, але зусім не падобны да атожылка княскага роду. І тварам, і манерамі, і постацьцю, і малінавым пінжаком, у які яго недарэчна апранулі, ён больш нагадвае былога камсамольскага актывіста, які робіць кар’еру ў бізнэсе.


ФОТА ГЕНАДЗЯ ЖЫНКОВА

**Зьлева — Натальля Гайда (Цэцылія), справа — Людміла Станевіч (Сыльва)**

Віктар Шабуня — дасьведчаны актор апэрэты — у ролі графа Боні Канчыяну блiскуча сыграў самога сябе. Ірына Цярэнцьева — жывая і какетлівая — запомнілася ў ролі графіні Стасі; ёй можна было нават дараваць ня надта зграбныя танцы. Герман Казлоў у ролі Фэры — задуменны, інтэлігентны і тонкі; ягоны натхнёны артыстызм надае спэктаклю дадатковае вымярэньне. Аднак гукарэжысэру варта было б паклапаціцца, каб лірычныя маналёгі Казлова лепей даходзілі да апошніх радоў партэру; яны на тое заслугоўваюць! Арнольд Ранцанц у ролі Мішкі — як заўжды, каларытны, поўны энэргіі ды неўміральнага аптымізму. Сцэнічнае слова гучыць у ягоных вуснах надзвычай смачна і асэнсавана. Здаецца, што рэплікі Ранцанца падчас спэктаклю добра чуваць ня толькі ў фае і буфэце, але й на блізкім тралейбусным прыпынку. Ранцанц і Казлоў штовечар зачароўваюць публіку бліскучымі імправізацыямі.

На акторскім партнэрстве і трымаецца ўвесь спэктакль. Рэжысэр Барыс Утораў не абмяжоўваў калектыўнай творчасьці актораў, і яны падзячаму цешацца гэткай нечаканай свабодай. Мастак Барыс Герлаван стварыў для іх стылёвыя, насычаныя сьвятлом дэкарацыі, што нават у змрочныя, драматычныя моманты ахоўваюць гледачоў і актораў ад залішняга суму. Як і касьцюмы, вытрыманыя ў сьветлай, сьвяточнай гаме. Добра прэзэнтуюцца хор і балет, у якім адметна глядзіцца маленькая японская танцорка, грацыёзная, як статуэтка Нэцке.

І пад уплывам гэткіх пазытыўных уражаньняў ужо ня важна, што «Каралева чардашу» ня сталася мастацкім адкрыцьцём. Што літаратурны матэрыял, паводле якога паўстаў спэктакль, быў узяты з другіх рук і далёкі ад арыгінальнай вэрсіі. Не дажылі мы яшчэ да сапраўднай самабытнасьці. Не навучыліся аналізаваць крыніцы, зь якіх бяром, ствараць свае канцэпцыі і прадаваць свой прадукт у іншыя краіны. Мы па-ранейшаму запазычваем — якасна, з прыемнасьцю для зроку, але нятворча. Гэта другаснасьць, якую мы мусім пераадолець.

**Юлія Андрэева**

# Архівы нашае незалежнасьці

**Сёлета ў Парыжы памерла Ніна Ляўковіч, удава прэзыдэнта БНР Міколы Абрамчыка. Менавіта яна на працягу 33 гадоў перахоўвала архіў Беларускай Народнай Рэспублікі. На сёньняшні момант лёс яго невядомы. У XX стагодзьдзі Беларусь страціла (часова альбо назаўсёды) мноства архіваў дзеячоў нацыянальнага руху і палітычных арганізацый. І пакуль не відаць, каб гэтая небясьпечная тэндэнцыя перарвалася.**

## Валізы Абрамчыка

У пачатку 1943 г. у Празе цяжка хворы прэзыдэнт БНР Васіль Захарка перадаў свае паўнамоцтвы і архіў інжынэру Міколу Абрамчыку. Паводле ўспамінаў Ларысы Геніюш, Абрамчык вывез у Бэрлін, а пасьля — у Парыж дзьве валізы дакумэнтаў БНР. У савецкія часы хадзілі чуткі, нібыта архіў гэты захоўваецца ў нейкай праваслаўнай царкве (нядаўна пачуў вэрсію, што ў турэцкай амбасадзе ў Парыжы), за што заплачаныя вялікія грошы, і ён мусіць быць перададзены ў свой час у вольную і незалежную Беларусь.

І сапраўды, спачатку згаданыя чамаданы захоўваліся ў Парыжы па адрасе: вуліца Гравілерс, 65. Пазьней Абрамчык перавёз іх у сваю кватэру, дзе яны, відаць, знаходзіліся і пасьля яго сьмерці. Праўда, да архіву БНР удава Абрамчыка Ніна Ляўковіч нікога не падпускала. Паводле публікацыі Кастуся Мерляка ў «Беларускім голасе» (верасень 1974-га), яшчэ ў апошнія гады жыцьця Абрамчыка Ангельскі сэктар Рады БНР намагаўся правесьці інвэнтарызацыю архіву і забясьпечыць яго належнай аховай. Але прэзыдэнт быў супраць. Пасьля сьмерці Абрамчыка ў 1970 г. была створаная камісія, якая хацела перадаць архіў у Скарынаўскую бібліятэку ў Лёндан. Ніна Ляўковіч перадаваць архіў адмовілася, а сябра Рады БНР Нікана, які прыехаў у Парыж з Аўстраліі, не пусьціла на парог...

Тое, што згаданы архіў перахоўвала ўдава Абрамчыка, у 1997 г. пацьвярджала дасьледчыца Ганна Сурмач: «Парыскі комплекс беларускіх дакумэнтаў уяўляе сабой значную цікавасьць для вывучэньня гісторыі беларускай дзяржаўнасьці, і добра было б, каб ён таксама стаў даступным для карыстаньня нашым навукоўцам». На жаль, цяпер даводзіцца клапаціцца не пра даступнасьць, а пра тое, каб архіў БНР хаця б захаваўся ў сваёй цэласьці.

## Скрыні Езавітава

Генэрал Кастусь Езавітаў з пачатку 1920-х да 1944 г. жыў у Рызе, дзе сабраў каштоўны прыватны архіў і бібліятэку. У жніўні 1944-га, выяжджаючы ў Бэрлін, ён ня змог забраць свае багатыя зборы. І ў аточаную бальшавікамі Рыгу ў верасьні—кастрычніку 1944 г. былі пасланыя зь Нямеччыны два беларускія дэсантнікі Мікола Рулінскі і Піліп Дайдчык. Яны здолелі вывезьці ў Бэрлін тры скрыні з кнігамі й дакумэнтамі генэрала.

У лютым 1945-га скрыні павандравалі ў Вэстфалію, у горад Гёкстэр, разам з БЦР. Там яны «захоўваліся» ў калідоры будынку, дзе жылі беларусы... Дакумэнты, якія трымаў пры сабе К.Езавітаў, разам зь ім былі перададзеныя ад'ютантам Браніславам Юрэвічам савецкай выведцы ў красавіку 1945-га. Сам агент Юрэвіч пасьля вайны застаўся жыць у Заходняй Нямеччыне ды спрабаваў атрымаць, як зямляк генэрала, гёкстэрскія скрыні. Але, відаць, не пасьпеў — пад пагрозай арышту ўцёк у савецкую зону акупацыі Нямеччыны. Вядома, што архіў Кастуся Езавітава быў падзелены групай беларускіх эміґрантаў, якія пасьля разьехаліся ў ЗША, Ангельшчыну і Аўстралію. Парадаксальна, але, калі б яго захапіў усё ж савецкі агент Б.Юрэвіч, напэўна, цяпер гэтыя дакумэнты захоўваліся б у Нацыянальным архіве Беларусі...

## Загадкавая аварыя

У міжваеннай Празе існаваў Беларускі загранічны архіў (БЗА) з багатымі зборамі і бібліятэкай. Сьлед ягоны губляецца ў першыя пасьляваенныя гады. Дасьледчыца Г.Сурмач выявіла ў Чэхіі архіўны дакумэнт, паводле якога БЗА ў 1947 г. яшчэ знаходзіўся ў Празе. Куды ж і калі ён зьнік з архіву МУС Чэхаславакіі, невядома. Сурмач дапускае, што яго маглі вывезьці «пэўныя савецкія службы і перадаць у нейкія ведамасныя спэцыяльныя сховішчы».

Магчыма, найбольш блізкім да разгадкі тайны зьнікненьня БЗА быў Уладзімер Калесьнік, дасьледчык беларускай эміграцыі ў міжваеннай Празе. 15 чэрвеня 1990 г. у «ЛІМе» ён пісаў, што «пасьля вайны фонды гэтага архіву аказаліся зьнішчанымі ў выніку аварыі». Калі гэта здарылася і пры якіх абставінах, Калесьнік не ўдакладніў. А цяпер яго ўжо няма ў жывых...

Недагаворка Ўладзімера Калесьніка нарадзіла вэрсію, нібыта цягнік са згаданым архівам ці то захапілі, ці то падарвалі беларускія «лясныя браты». Гэта магло здарыцца ў Заходняй Беларусі пасьля 1947 г. Такую вэрсію выклала газэта «Пагоня» (1996, 22—28 сакавіка). Праўда, інфармацыя гэтая нічым не пацьверджаная.

## Мех Федарчука

Гэтую сумную гісторыю распавёў навуковец Андрэй Катлярчук падчас свайго нядаўняга прыезду з Швэцыі ў Беларусь. У 1948—70 г. у Швэцыі дзейнічала арганізацыя «Беларуская Грамада», заснаваная эмігрантамі Васілём Лукашыкам і Язэпам Федарчуком. Грамадоўцы былі досыць актыўныя, імкнуліся абараніць мясцовых беларусаў ад польскіх і расейскіх уплываў. Пра гэтую іх дзейнасьць красамоўна сьведчыў архіў, які захоўваўся на кватэры Лукашыка. 17 сакавіка 1975-га Васіля Лукашыка не стала. Архіў зь ягонай кватэры забраў Федарчук, які напакаваў дакумэнтамі цэлы мех. Куды ён яго завёз, невядома. Калі Язэп Федарчук памёр, удава Лукашыка зьвярнулася да ягоных сваякоў з просьбай вярнуць некаторыя дакумэнты мужа. Але меха ў кватэры Федарчука не аказалася: альбо дакумэнты хтосьці зьнішчыў (што найбольш верагодна), альбо яны былі камусьці перададзеныя.

На эміграцыі хадзілі чуткі, што В.Лукашык пасьля вайны меў таемную перапіску праз Польшчу з сваім вядомым земляком, дзяржаўным дзеячом БССР Сяргеем Прытыцкім. Пасьля зьнікненьня архіву, пацьвердзіць альбо абвергнуць гэта будзе цяжка.

## Скарбы пад царквой

У студзені 2003-га Лявон Юрэвіч надрукаваў у нью-ёрскім «Беларусе» зацемку «Саўт-Рывэрскі збор», прысьвечаную лёсу аднаго з найбагацейшых архіваў беларускай эміграцыі. Архіў гэты быў заснаваны ў 1974 г. і захоўваецца пад праваслаўнай царквой сьвятой Эўфрасіньні Полацкай у Саўт-Рывэры, колішнім цэнтры эмігрантаў — прыхільнікаў Беларускай цэнтральнай рады. Першапачаткова яго стваральнікі планавалі заснаваць яшчэ і музэй, і беларускую бібліятэку. Кастусь Мярляк скептычна паставіўся да ініцыятывы БЦР. «Невядома, хто адказны за той архіў і якія ёсьць гарантыі карыстаньня фондамі», — пісаў ён на старонках «Беларускага голасу». Так і сталася. У гэты архіў былі перададзеныя паперы Радаслава Астроўскага, Юр'я Сабалеўскага, Юркі Віцьбіча і іншых вядомых людзей. Матэрыялы не былі інвэнтарызаваныя, ніхто іх не апрацоўваў, і амаль нічога не публікавалася. Некаторыя скрыні з дакумэнтамі, паводле Юрэвіча, нават ніколі не пераглядаліся…

Сёньняшнія ўладальнікі архіву так і не дапусьцілі да яго Л.Юрэвіча, які нават выступіў з ініцыятывай выданьня кнігі «Саўт-Рывэрскі збор». Напэўна, там яшчэ жывыя адгалоскі былой варожасьці паміж бэцэраўцамі і бэнэраўцамі, інакш як растлумачыць гэтую сытуацыю? Кажуць, нават Вітаўт Кіпель ня змог патрапіць у гэты архіў.

## Ахвяры катоў і мышаў

Бібліёграф і архівіст Мікола Панькоў больш за сорак гадоў зьбіраў матэрыялы для свайго «Ўсебеларускага архіву». Заснаваў ён яго ў першыя пасьляваенныя гады ў Заходняй Нямеччыне, пазьней архіў месьціўся ў нью-ёрскай кватэры Панькова. У ім былі каштоўныя зборы беларускіх кніжак, пэрыёдыкі, дакумэнтаў, фатаздымкаў.

Паводле сьведчаньня Л.Юрэвіча, «Усебеларускі архіў» аблюбавалі каты і коткі, якіх разьвяла ў кватэры жонка Панькова. «І праз год па сьмерці Міколы Панькова кнігі, камплекты часапісаў, газэтаў, тэчкі з архіўнымі матэрыяламі, нават мэбля, нават сьцены, здавалася, мелі той спэцыфічны пах, што нагадваў пра сапраўдных гаспадароў хаты». І ўсё ж архіў Панькова быў уратаваны ды знаходзіцца цяпер у Фундацыі П.Крэчаўскага. А колькі прыватных збораў загінулі па кватэрах беларускіх эміґрантаў пасьля іх сьмерці! Часта сваякі недаацэньвалі важнасьці дакумэнтаў, выкідалі іх, палілі. А перапіску прэзыдэнта БЦР Міхася Зуя пасьля яго сьмерці паклалі ў гараж, дзе яе зьелі мышы…

## Доступ абмежаваны

Беларуская паваенная палітычная эміграцыя практычна ня здолела стварыць сталых навуковых і архіўных установаў (адзіныя выключэньні — БІНіМ у Нью-Ёрку ды Скарынаўская бібліятэка ў Лёндане). Таму некаторыя эміграцыйныя дзеячы ды арганізацыі здавалі свае зборы дзяржаўным архівам на Захадзе.

Эміграцыйная група Сяргея Хмары, які жыў у Таронта, свае паперы вырашыла перадаць у Нацыянальны архіў Канады ў Атаве. Яшчэ ў 1960 г. іх хацеў купіць альбо ўзяць «на часовае захаваньне да часу звароту ў рукі Ўраду Вольнае Беларусі» Калюмбійскі ўнівэрсытэт. Аднак хмараўцы адмовіліся.

Паводле словаў Віталя Зайкі, архіў Хмары будзе ўдаступнены толькі праз 50 гадоў. Гэта тым больш дзіўна, што незалежнасьць Беларусі была адноўленая яшчэ пры жыцьці ўладальніка і хаваць ад дасьледчыкаў архіў не было сэнсу. Але мо сам Хмара тут і ні пры чым. Яшчэ ў 1994 г. Вітаўт Кіпель рабіў запыт у Атаву і атрымаў адказ, што архіў Хмары будзе даступны «недзе ў 1995 г.». Аднак і ў канцы траўня 1995 г. архівы Хмары не былі ўпарадкаваныя. У верасьні 1996-га я атрымаў ліст з Нацыянальнага архіву Канады за подпісам супрацоўніка Аддзелу манускрыптаў Мірона Момрыка (цытую ў правапісе арыгіналу). «Вы пытаецеся пра Калекцыю Мар'яна Зіняка (Сяргея Хмары) у Нацыянальных Архівах. Нажаль мушу паведаміць Вас, што доступ да гэтай архіўнай калекцыі ёсьць агранічаны згодна з жаданьнямі ягонай сям'і. Гэтае агранічэньне застанецца ў сіле да часу адкліканьня», — пісаў сп.Момрык. Прынамсі, адной загадкай стала менш.

**Сяргей Ёрш**



Рыгор Барадулін

# З запазухі

Працяг. Пачатак у «НН» № 19

## Назіраньне й парада

Марушка казала пра аднаго з многіх вушацкіх пітакоў:

— У яго галава на паўлітра ўссаджана…

А мама раіла мне, калі я дужа ўлягаў у акавітую:

— Трэба табе, сынок, пітушку перавязаць.

## Як сарока...

Селянін любіць сваю хату. Як хвіліна вольная здараецца, налюджвае яе, нядзеліць. За хатай, як за сабой, глядзіць.

Усё заўважае, усё прыкмячае і ў суседніх хатах.

І раптам скажацца: хата стаіць як сарока без хваста — без хлявоў, безь сяней.

## Ведаюць...

Летнім днём зьмікіцілі на трох. Каля рэчкі так цёпла стала, што разуліся. Напіліся да пакатунку. Адзін трохі ачухаўся й намагаецца абуцца. Сябры ляжаць і млява пытаюцца:

— Ты куды?

— Боты дарогу ведаюць.

І дарэчы кажацца: п'яны як бот. А вось гэта дакладна прыкмечана: п'ець, як у бот ліець.

## Швургалка

Перад экзамэнамі ў школе звычайна рыхтавалі шпаргалкі.

Прыйшоў дамоў, кажу, што шпаргалка дапамагла. А мама кажа:

— Увесь час табе швургаць ня будуць. Лепей на сваю галаву спадзявайся.

Мама па-свойму пачула слова: швургалка. Гэта значыць, яе швургаюць, кідаюць.

## Дыялёг

— Ты сьпіш?

— Не.

— Пазыч сто рублёў.

— Сплю, сплю…

## Вінавата пошта

Тое пісьмо, у якім ты прасіў прыслаць грошы, мы не атрымалі.

## Якая ў яе?

У старой памёр сын. Засталася нявестка ў хаце жыць. Ну й надта на хлопцаў падкая была. Дужа круцілася. Ці, як вушацкія любяць казаць, была слабая на перадок. Сьвякроў толькі дзіву даецца:

— Там у яе цынкавая прыдзелана ці дзеравянная? Як толькі трываіць?

Хоць як бы былой радні, а спачувае.

## Радуйцеся...

Шляхціц ехаў да каханкі-шляхцянкі й прыгаворваў ільцам:

Радуйцеся, мудэлькі,
Паедзіце да Адэлькі...

Каму радасьць, а каму праца.

## Разумны...

Разумны Мікітка: у чапец насярэць і на кут валачэць дый кажаць: «Тата, мама, кака туцкі езьдзіць».

(Туцкі — калі малога нясуць заплеччу).

## А мне калі?

У беднаватай сям'і некалькі дачок. Самая меншая Варачка. Ёй, вядома, большая ўвага. Паставілі гатаваць булён. Старэйшай баліць есьці, просіць наліць хутчэй. А маці супакойвае:

— Хай варыцца!





А дачушцы, бо недачувала, крыўдна:

— Усё Вараццы ды Вараццы, а мне калі ж?

## Раз купіў...

Яўрэй купіў брус мыла, а думаў, што сала. Сеў, есьць — аж пена з роту. Ідзе мужык дый пытаецца:

— Што гэта ты мыла ясі?

— Міла ня міла, раз купіў, дык трэба есьці, — адказаў няшчасны пакупец, сапраўды, як мыла зьеўшы…

## Хоць за чорта...

Прыйшла дзяўчына на споведзь дый ушкодзілася лёгка. Сьвятар мякка намякае:

— Дзяўчына, ты закурыла.

А тая ўсё вагаецца:

— І сама ня ведаю, ці за Курылу йсьці, ці за Гаўрылу.

Сьвятар сваё, дзяўчына сваё. Не стрываў сьвятар ды папросту кажа:

— А хоць за чорта йдзі, толькі пад нос ня бздзі!

## На пні!

Салдат павёў маладзіцу ў лес. Глыбока зайсьці цярпеньня ня стала, бо ўсё стала. І пакаціў на лядах на ўзьлеску. У запале нічога ня бачыў. Маладзіца апынулася на пні. Пачалося каханьне. Яна й крычыць:

— Вой, на пні, салдацік!

А ён думае, што просіць: напні! Ну й напінае.

## Знойдзецца...

Хадзілі па старцах сьляпы з павадыром. Зайшліся ў хату. Гаспадыня й пытаецца:

— Можа, вы есьці хочаце?

А сьляпы да павадыра:

— Калі дась смачнага, дык кажы, што на ласы кусочак знойдзецца куточак.

## Не навязалі...

Маладзіца з вушацкай вёскі казала сяброўкам:

— Я ж была ў горадзе. Там усе машыны навязаны. А ў майго дурня не навязалі, дык ён і разьбіў машыну.

Трэба ж знайсьці якую абэлку, каб сына выгарадзіць.

## Дамовіцца...

Хлопец з прозьвішчам Пузатка варыць смалу. Пачалі за сырую руку асфальтаваць цэнтральную вушацкую вуліцу. Вострыя на язык местачкоўцы спаміж сабой:

— І на тым сьвеце каля катлоў будзіць грэцца. Цяпер дамовіцца.

## Канкрэтны адрас

Цешча прыйшла праведаць дачку дый затрымалася са сваімі заўвагамі ды капрызамі. Бацька маладзёна й раіць яму:

— Кій у руку трэба было ўзяць ды паказаць ёй, у які бок дамоў ісьці.

Адрас заўсягды мусіў быць канкрэтны.

## Пасушыў

Пан паляваў на качак, давялося выхадзіць не адно балота. Вярнуўся з паляваньня й даручыў парабку пасушыць боты. А той, нядоўга думаючы, паставіў панскія боты ў яшчэ гарачую печ.

Ураніцы пан просіць падаць яму боты. А парабак адказвае:

— Панок, перадкі караткі, а падашвоў не знайшоў…

## Пра мужыкоў

Паняцьце красы ў стасунках да мужчынаў адноснае.

Мама любіла вясёла казаць: мужчына абы троху лепшы за чорта — сем красуняў возьмець.

(У дадзеным выпадку чорт — мерыва антыкрасы.)

У кожнай жонкі свае меркі годнасьці мужыка.

У адной: мужык падшлёпнаваты, няўзглядны, алі дужа слушны.

У другой: на від мужык хоць лапаць, абы жыць ды ня плакаць.

У іншай: сякі-такі мужчына, за ім дровы й лучына.

Не зусім лашчыць мужчынскае вуха й такая катэгарычнасьць: ці мужык памёр, ці пранынік сплыў.

Затое заходзячы ў хату, дзе дым курэцкі слупом стаіць, маладзіца скажа: мужчынкам пахніць…

## Мэркантыльнасьць і разважлівасьць

Сялянская мэркантыльнасьць нескупая, яна пра няздатнага кажа:

— Хай бы ўжо пнём радзіўся, хоць бы сьвіньня зад пачасала.

І думка пра выгоду, і клопат пра жывёлу.

А разважлівасьць разважае:

— Нячым бабыля ў хату пусьціць, лепі барану на куце паставіць, на барану хоць зьняць атнімку (анучку з кухні) павешаіш…

## Ня толькі за локаць...

Схапіліся, зацяліся зяць зь цешчай. Усе довады й абразы перабралі, ніхто не саступае. І нарэшце цешча крычыць:

— Зьдзень штаны ды ўкусі сябе за свой канец, калі такі сьпец.

Выходзіць, ня толькі за локаць нельга сябе ўкусіць.

## Без цырымоніі

Да шляхцянкі заходзіць госьць. Тут жа на стале пачынае аддыхвацца, як пасьля цяжкой працы, самавар. Гаспадыня гасьцінна запрашае:

— Проша піць гарбату без цырымоніі.

Без цырымоніі — значыць бяз цукру. Бальшавікі забралі і ў шляхты ўсё. Гонар толькі не змаглі забраць.

Даводзілася і шляхце, і мужыкам піць гарбатку і нават з гузікам за шчакой. Каму думка, каму ўспамін гарбату саладзілі.

## І спагада, і замілаванасьць...

Цяжка пералічыць усе эпітэты, якія ў народзе прыдуманы (ці, як кажуць, прыкладзены) да гарэлкі: хоць і горкая, але словам салодкім мянуецца:

— Будзем жа мы гарэлачку піці, мядочкам закусваць.

Гарэлка — і замілаванасьць, і наканаванасьць:

Горка гарэлка, алі п'юць,
Дрэнна замужам, алі йдуць.

Ушаноўваецца й чарачка-пазалачаначка:

— Ой, чарачка-каточак, пакаціся ў раточак.

— Ня стуча, ня груча, па костачках шчакача.

А колькі спагады ў такой заўвазе: стаканок малінкоўскі з кружаўцом выпіваіць не аддыхая…

## Рант

У адной кабецінны сын недзе на моры. Суседка й пытаецца, якое ж у яго званьне? Маці адказвае:

— Ці будзіць капітан другога ранту, ці трэцьцяга.

Рант вядомы па ботах, а ранг — невядомае слова.

## Прышлі, мама...

Зь лёгкай ці наадварот рукі Леніна абрэвіятуры за савецкім часам амаль выцесьнілі нармальныя словы, нармальныя назовы. Здаралася, што заабрэвіятураваліся як ня цэлыя сказы.

У раёнах папулярнай была абрэвіятура (а хочацца сказаць: абракадабра) ПМК, што ў перакладзе на нармальную мову азначала «перасоўная мэханізаваная калёна». Задачы ў гэтай калёны былі не зусім ясныя, а вось заробкі дужа празрыстыя, ці, лепей сказаць, плыткія — праз пальцы працякалі імгненна. Таму й расшыфроўвалася ПМК так: «Прышлі, мама, капейку» альбо «Пакуль мама корміць». А сельгасхіміо больш сутнасна называлі хімдым.

Часам думаецца, што абрэвіятуры — добрая падмога лягапэдам.

## Як засяліліся...

Вушацкі так званы Дом саветаў адразу ж ахрысьцілі Чорным домам, а спаміж сабой — гестапа. Усё дзеля змрочнага колеру.

Пачалося засяленьне. Пры ўваходзе мыюць у тазіках ногі. Бо незаасфальтавана навокал ні мэтра. У кабінэтах стаіць што папала. У вартаўніка крэсла-ложак (адразу ж жадаецца ндрэмнаму вартаўніку дабранач).

З туалетамі туга. Часта забіваюцца. У прамове ўрачыстай з нагоды ўваходзінаў старшыня райвыканкаму заклікае купіць туалетнай паперы й меней ужываць прэсы. Абавязковае ўстанавіць дзяжурства па мужчынскім і жаночым туалетах. Туалеты не падпісаны. Галоўны фінансіст забрыў у жаночы туалет. У яго пытаюцца:

— А што вы тут робіце?

— А я ня ведаў.

І старшыня прапануе зрабіць туалет на дванаццаць ачкоў на двары. Яшчэ абавязвае ўсіх азнаёміць з інструкцыяй, як карыстацца туалетам.

Апошні клопат у гаспадара: вылічыць плошчу пылу й падзяліць на колькасьць жанчын.

Ня проста так любілі партыйна-савецкія кіраўнікі песьню, дзе былі словы «спакой нам толькі сьніцца…».

*Працяг будзе.*

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Даражэнькі Іа**, «пряздрявляю з днём раждженьня, жадаю шчасьця ў лічна(стна)й жызьні». Puch. Ці знайшоў ты свой хвост?

**Каханы валацуга**, з чарговым 14-годзьдзем цябе, Сонейка маё. Жадаю ўсё ж пасталець, і няхай яхтай тваёй мары станецца карабель Царквы. Тваё люстэрка

### КАНТАКТЫ

**30-гадовая** разумная дзяўчына, з вышэйшай адукацыяй, без кватэры, шукае сябра для стварэньня беларускай сям'і. А/с 114, 220088, Менск-88

**Беларус** 39/188/85, шукаю ў жонкі беларуску, бляндынку (неабвязкова), толькі высокую (па-за 180 см), спартыўную, бяз шк.зв, пазашлюбных дзяцей, былых мужоў і г.д. Слава. А/с 461, 220050, Менск. Т.: 221-21-81

**Шукаю кантактаў** зь беларускімі патрыётамі. А/с 714, 222120, Барысаў-1

**Шукаем інфармацыі** пра беларускі летнік. Ці будзе такі сёлета? Т.: 233-44-58. Zmicier@hotmail.com

**ZBSB.org** — сайт Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына». Т.: 289-31-94

**Olsa.by.ru** — сайт беларускай сярэднявечнай музыкі

**Усё пра моладзь** 1970—85 г. нараджэньня — у кнізе Паўла Севярынца «Пакаленьне Маладога Фронту» ў Інтэрнэце: mfront.org або knihi.com

**Bykau.by.ru** — усё пра Васіля Быкава

**www.belreform.org** — сайт, прысьвечаны 450-годзьдзю Рэфармацыі ў Беларусі

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Беларускія кнігі** і часопісы, відэа і CD. Цяпер і ў Барысаве. Т.: (01777) 96-0-59. Алег

**Кнігі, аўдыё**, відэа, CD можна набыць у Гомелі на пл.Паўстаньня штонядзелю ад 9.00 да 13.00

**«Беларускі кнігазбор»** — у кнігарнях апошнія паасобнікі Я.Карскага, Янкі Купалы, І.Дамейкі

**Прадам ці абмяняю** кнігі. Прапаную «Краіна Беларусь», «Дзесяць вякоў беларускай гісторыі». Дашлю сьпіс прапаноў. Т.: 8-029-753-91-96

**Набуду CD-R** беларускіх гуртоў Mp3. А/с 12, 212030, Магілёў-30

**Куплю** энцыкляпэдычны даведнік «Беларускі саюз мастакоў», 1998 г.в. Т.: 260-59-63 (пасьля 21.00)

### КУПЛЮ

**Аднапакаёўку** ў Менску. Т. (у Магілёве): 26-41-01, 32-67-67

### ПРАДАМ

**Клей для пліткі**, кіт, тынкоўку, рубэройд. Т.: 224-75-21, 8-029-756-45-78

**Электронную друкарку** «Gabrielle 110 DS»: кірыліца і лацініца, дысплей (30 знакаў), памяць ды іншыя штукі. Т.: 223-34-79 (у працоўны час). Крысьціна

### ПРАЦА

**Патрэбныя паслугі** сумленнага сантэхніка. Замена трубаў каналізацыі ў доме пад Менскам. Т.: 223-34-79 (у працоўны час). Крысьціна

**Вырашэньне** кампутарных праблем. Т.: 264-68-90

**Беласточчына**: перасячэньне мяжы, аўтасуправаджэньне, дастаўка і прывоз грузаў. Т.: (01631) 22-7-78. Віктар

**Шаноўнае панства**, масажыст прапануе свае паслугі. Т.: 253-88-02

## КОНКУРС ДЛЯ ПРАЗОРЛІВЫХ!!!

«Наша Ніва» абвяшчае новы конкурс. Таго з чытачоў, хто адгадае, якое незалежнае выданьне забароняць наступным, Рэдакцыя ўзнагародзіць пажыцьцёвай падпіскай на газэту «Беларусь учора». Падвядзеньне вынікаў конкурсу — адразу пасьля абвяшчэньня чарговых рашэньняў міністра Падгайнага.

## КРЫЖАВАНКА



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 5.** Аповесьць Міхася Чарота, а таксама «прафэсія» марнатраўнага сына. **8.** Салодкая студзяністая страва. **9.** «Бяжы, ..., бяжы». **11.** Горад, у якім месьціцца кандытарская фабрыка «Чырвоны мазыранін». **14.** Заклінальная формула ў вэдызьме й індуізьме. **16.** Пачуцьцё крайняй безнадзейнасьці, упадку духу. **18.** Ячныя крупы, а таксама каша з гэтых круп. **20.** Той, хто па другі бок лініі фронту. **21.** Работнік, які ня супраць «раскулачыць» уласнае прадпрыемства. **22.** Паводле парапсыхалягічных уяўленьняў, біяполе чалавека. **23.** «Не было Галілея і Боба Марлея, не было Сальвадора ...». **24.** У фатаграфіі: асноўны кампанэнт многіх праяўляльнікаў. **26.** Від мастацтва, забаронены Туркмэнбашы. **27.** Кавалак, луста. **28.** Японская сыстэма самаабароны бяз зброі, а таксама сродак супраць жука. **31.** Яна можа быць шарыкавая і гелевая. **33.** Прыроднае хімічнае злучэньне, складовая частка горных пародаў і рудаў. **36.** Парода сабак. **37.** На кампутарным жаргоне — карыстальнік. **38.** Улюбёны занятак некаторых палітыкаў.

**ПА ВЭРТЫКАЛІ: 1.** «Чырвоная ...», але ня зорка. **2.** Сьцюдзёны паўночны вецер. **3.** Тое, без чаго не бывае злачынства. **4.** Ашуканец, прайдзісьвет. **6.** Парусінавая стрэшка, якая засьцерагае ад сонца і дажджу. **7.** Нашаніўскі аўтар Уладзіслаў Сівы-Сівіцкі пісаў пад псэўданімам Стары ... . **10.** Прылада для вымярэньня ціску вадкасьці або газу. **12.** Старажытныя рымляне маглі назваць гэтак любую пісьмовую працу, мы звычайна — толькі кепскую. **13.** Беларускі сьпявак, цёзка беларускага пісьменьніка. **15.** Паверхневы грунт на Месяцы. **17.** Папярэднік аўтобуса і тралейбуса. **18.** Кручаная мяккая шарсьцяная кудзеля. **19.** Трава, што адрастае пасьля першага ўкосу, а таксама сталіца дзяржавы ў Паўночнай Амэрыцы. **25.** Вядомы француcкі кампазытар і піяніст. **29.** Гэтаму газу шкодзяць ракеты й дэзадаранты. **30.** Амэрыканская рэп-зорка. **31.** У літаратуры: намёк на агульнавядомы палітычны, гістарычны ці літаратурны факт. **32.** Ён можа быць грэцкім, манчжурскім, земляным. **34.** «Трапіў у ... — ні ўзад ні ўперад». **35.** Тое, што застаецца ў слоіку, калі гуркі скончаюцца.

**Склаў Сяргей Петрыкевіч**

## ЁСЬЦЬ МЕРКАВАНЬНЕ

# Усе беды ад штаноў



Прычынаю ўсіх сусьветных бедаў кароль Свазыленду Мсваці абвясьціў жанчын, якія ходзяць у штанах. Як сказаў апошні абсалютны манарх Афрыкі ў радыёзвароце да нацыі, «праклён падзе на тых жанчын, што носяць штаны, і на тых, хто носіць адзеньне сваіх мужоў. Вось чаму сьвет сёньня такі, які ён ёсьць». Апрача гэтага, кароль асудзіў панятак правоў чалавека. Паводле ягоных словаў, «Бог стварыў людзей і даў кожнаму ягонае месца ў грамадзтве. Нельга зьмяніць дадзенае Богам — гэта брыдота перад аблічам ягоным». Манархія Мсваці абсалютная. Краінай кіруюць прыдворныя дарадцы, апазыцыя забароненая. Сам кароль цяпер жанаты зь дзевяцьцю жанчынамі, дзясятую чакае вясельле.

**Паводле «Reuters»**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Баршчэўскі Л. Літаратура ад старажытнасьці да пачатку эпохі рамантызму:** Папулярныя нарысы. — Менск, 2003. — 512 с.: іл.

У якасьці дадатку друкуюцца ўрыўкі з мастацкіх твораў, бібліяграфічныя матэрыялы, слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў, а таксама сынхранічныя табліцы культурных і гістарычных падзеяў. Цана 5500 руб.

**Вішнеўскі А. Палітыка-прававы рэжым савецкай дзяржавы (1917—53 г.).** — Менск, 2003. — 224 с. Наклад 500 ас.

Аўтар манаграфіі, базуючыся на фактах з гісторыі савецкай дзяржавы, прааналізаваў фэномэн таталітарнага грамадзтва. Асаблівую ўвагу ён зьвярнуў на мэханізмы замацаваньня рэпрэсіўнай палітыкі ў прававых дакумэнтах 1917—53 г., а таксама на дзейнасьць НКВД па правядзеньні тае палітыкі «ў жыцьцё». У «Акадэмкнізе» — 5500 руб.

**Сіўко Ф. Ягня ахвярнае:** Прыпавесьці, аповесьць. — Віцебск, 2003. — 128 с.

У кнігу ўвайшла бэлетрыстычная трылёгія «Ўдог», а таксама аповесьць «Ягня ахвярнае» — сацыяльна-псыхалягічны твор з элемэнтамі дэтэктыву. Ёсьць на выставе ў ТБМ.

**Стралко В. Непагасны агонь = Непогасний вогонь: Украінскія паэты — па-беларуску, беларускія паэты — па-ўкраінску:** Пераклады. — Менск: Энцыкляпэдыкс, 2003. — 224 с. Наклад 100 ас.

Украінец з паходжаньня, Валер Стралко доўгі час жыў у Беларусі. Ягонымі намаганьнямі загучалі па-беларуску Т.Шаўчэнка, Леся Ўкраінка, І.Франко. Сваё ўкраінскамоўнае ўвасабленьне знайшлі вершы Янкі Купалы, Якуба Коласа й М.Багдановіча. У «Акадэмкнізе» — каля 2500 руб.

**Янушкевіч Я. Дыярыюш зь XIX стагодзьдзя: Дзёньнікі Міхала Галубовіча як гістарычная крыніца.** — Менск, 2003. — 352 с. Наклад 300 ас.

Міхал Галубовіч — архіяпіскап, грамадзкі дзяяч, добра вядомы ў сярэдзіне XIX ст. сярод прадстаўнікоў беларускага культурніцкага руху, — вёў дыярыюш цягам 1858—60 г. Ён распавядае, як губэрнскі Менск наведаў цар Аляксандар II, падае асобныя факты зь лёсу Паўлюка Багрыма й Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, піша і пра ўласныя «прыгоды». Расчытаць стары рукапіс (а свае занатоўкі М.Галубовіч часам рабіў тайнапісам) здолеў Язэп Янушкевіч. Публікуецца і ў арыгінале па-польску, і ў беларускім перакладзе. Цана — амаль 10 тыс. рублёў. Шукайце ў «Акадэмкнізе».

**Довнар-Запольский М. История Белоруссии.** — Минск: Беларусь, 2003. — 680 с.

Рукапіс гэтай кнігі быў падрыхтаваны да друку яшчэ ў 1920-я гады, аднак пры жыцьці аўтара так і ня быў апублікаваны. На пачатку 90-х кніга выходзіла па-беларуску. Расейскамоўнае перавыданьне 8200 руб.

**Иоффе Э. Белорусские евреи: трагедия и героизм: 1941—1945.** — Менск, 2003. — 428 с.: 52 іл.

Тэмы заяўлены важныя: «Галакост зь першых дзён», «Галакост і вэрмахт», «Габрэйскі Супраціў» і інш. Аднак аўтарскія адкрыцьці кшталту «палітыка татальнага зьнішчэньня была прызначана толькі для яўрэйскага народу», частая адсутнасьць спасылак на крыніцы, наіўнасьць высноваў зьніжаюць навуковую вартасьць працы. Кніга надрукаваная ў Смаленску накладам 100 ас.

**Таццяна Вабішчэвіч; ВР**

## КОНКУРС «НН»

Колькасьць лістоў, што прыходзяць на конкурс спэктральных памятак, значна зьменшылася, а варыянту, які б захапіў Рэдакцыю, яшчэ не прагучала. Фраза мусіць лёгка запамінацца, таму пажадана, каб яна была рытмічнай. У ёй не павінна быць складаных, незразумелых дзіцяці словаў («**Ч**ароўны **А**геньчык, **Ж**урботная **З**ьнічка, **Б**оскім **С**ьвяці **Ф**аервэркам!»), цяжкіх для вымаўленьня зьбегаў літараў. Яна ня можа быць занадта абстрактнай («**Ч**алавек, **А**трымаўшы **Ж**ыцьцё, **З**ьяўляецца **Б**ожым **С**тварэньнем **Ф**актычна»). Яна павінна мець сэнс, ня мець нэгатыўных канатацый («**Ф**іфа **С**ела **Б**аляваць — **З**ельц **Ж**аваць, **П**упок **Ч**асаць»), але можа быць не пазбаўленая парадаксальнасьці. «**Ч**ароўная **А**фрыканская **Ж**ырафа **З**ь **Б**егемотам **С**макавалі **Ф**інікі» з часопісу «Пачатковая школа» таксама не ідэальны варыянт дзеля досыць неабавязковых словаў «чароўная» і «смакавалі». Лічы, патрэбны добры дзіцячы верш... Мо бяда ў тым, што мала паэтаў узялі ўдзел у конкурсе? А прыз для пераможцы каштоўны — кніга «Краіна Беларусь. Ілюстраваная гісторыя». Чакаем новых варыянтаў.

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Сержуку А. з Клімавіч.** Частку фактаў, якія Вы падаяце ў артыкуле «Праз праўду да свабоды», «НН» ужо друкавала. Іншае можна знайсьці ў Інтэрнэце. А вось зьвестак пра тое, што робіцца ў Клімавічах, нідзе няма. Напішэце нам пра гэта.

**В.Г. зь Менску.** Артыкулаў па-расейску газэта не друкуе.

**Эдуарду Т. з Смалявіч.** Вашая тэорыя этнагенэзу ліцьвінаў выклікае спрэчкі. Прапануйце яе найперш спэцыялістам-гісторыкам у «Беларускі гістарычны агляд», «Сшыткі гістарычныя», «Спадчыну» ці «ARCHE».

**Антаніне К. з Крупак.** Дзякуй за добрыя словы. Здароўя й посьпехаў Вам і радзіне Серанковых.

**Эдуарду Х. з Бабруйску.** Калі Вы лічыце, што чыесьці артыкулы — «сьвядомая правакацыя», дык мусіце сваю думку сур'ёзна абгрунтоўваць. Бяз доказаў не пераконвае.

«НН» дзякуе за падтрымку Кастусю Акулу з Таронта і Янку Запрудніку зь Нью-Джэрзі.

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ______

Імя і прозьвішча ______

Адрас, тэлефон ______

Наша Ніва
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Сяргей Ёрш |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.

Наклад 3488.

Нумар падпісаны ў друк 4.06.2003.

Замова № 2889.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а